ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 90 (4342)
ЧАЦЬВЕР, 21 красавіка
1929 г.

МЕНСК, Савецкая 63

СЁНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: Перадавы — Прамысловасьці — баявы апарат кіраўніцтва.

М. ГАРЫН — У барацьбе з клясавымі ворагамі і апартуністамі пабудуем бясклясавое грамадзтва (2-я і3-я стар.).

Юр. ТАНАРЧУК — Крызіс крочыць... (3 стар.).

СУСТРЭЦЬ 1-е МАЯ НОВЫМІ ПЕРАМОГАМІ. (1 стар.).

Вопыт перадавых барацьбітоў за якасьць перанесьці на ўсе прадпрыемствы харчовай індустрыі. (2-я стар.). — Дабіцца рашаючай перамогі ў ільназагатоўках. (2 стар.).

Масава-выхаваўчую работу — на вышэйшую ступень. (2 стар.).—Ліст нямецкіх рабочых выклікаў творчы ўздым сярод чыгуначнікаў БССР (2 стар.).

Наперад да суцэльнай пісьменнасьці! (4 стар.).

Падрыхтоўка да 1 мая. (4 стар.).

КІТАЙ — 90-тысячная японская армія сканцэнтравана ў Шанхаі. (4 стар.).

ПОЛЬШЧА — Усеагульная забастоўка с.-г. рабочых. (4 стар.).

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі. (4 стар.).

Прамысловасьці—баявы апарат кіраўніцтва

Абстаноўка, у якой адбываецца наша гаспадарчае будаўніцтва, настойліва патрабуе д прамысловасьці выключна высокіх тэмпаў работы, поўнай эладжанасьці ўсіх зьвеньняў прамыслова га мэханізму, выразнага, канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва з боку апарату, штодзённай праверкі выкананьня.

Гэтыя патрабаваньні вынікаюць з напружаных вытворчых заданьняў заключнага году пяцігодкі, дыктуюцца міжнароднай абстаноўкай, якая ўсё больш абвастраецца, задачамі максымальнага выкарыстаньня мірнай перадышкі для найбольшага ўмацаваньня эканамічнай магутнасьці Савецкага Саюзу.

Праблема паляпшэньня апэрацыйнага і тэхнічнага кіраўніцтва прамысловасьцю складае адну з кардынальных задач гаспадарчых, партыйных і прафэсыянальных арганізацый. Тав. Сталіным у вядомай прамове на нарадзе гаспадарнікаў задача — «па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць» пастаўлена іменна, як важнейшая прадпасылка для перабудовы работы прамысловасьці, для выкананьня ўсіх шасьці ўмоў перамогі.

Канкрэтнае кіраўніцтва — стрыжнёвае пытаньне, з якім непарыўна зьвязаны самыя надзённыя інтарэсы прамысловасьці.

Але, каб канкрэтна, апэрацыйна кіраваць, каб уваесьці ў тэхніку справы, неабходна такая арганізацыйная структура, якая-б забясьпечыла найбольшае набліжэньне гаспадарчага апарату да нізавых вытворчых зьвеньняў, якая-б давала магчымасьць палепшыць жывую сувязь, узмацніць дапамогу прадпрыемствам. Канкрэтнае кіраўніцтва патрабуе гібкага, рухомага апарату, выпішчэньня грамоздкасьці, непаваротлівасьці.

У гэтым сьвятле мерапрыемствы партыі па разбуйненьні раду гаспадарчых арганізацый (НКШЗ, НКГ і інш.) адыгрываюць выключна важную ролю. Падобны-ж сэнс мае і разбуйненьне ВСНГ СССР, вылучэньне з яго складу лёгкай і лясной прамысловасьці і рэарганізацыя самога ВСНГ у наркамат цяжкай прамысловасьці.

Прыстасоўна да ўмоў БССР ВСНГБ ператвораны ў наркамат лёгкай прамысловасьці. Пад яго ведамасьцю пакінуты наступныя аб'яднаньні: тэкстыльнае, скуранае, шкляное, запалкавае, паліграфічнае, хэмічнае, Белутыль і тэхвыдавецтва.

Гаспадарчыя арганізацыі, якія ўваходзяць у сыстэму Народнага Камісарыяту цяжкай прамысловасьці СССР, аб'яднаны пад кіраўніцтвам упаўнаважанага Наркамату цяжкай прамысловасьці пры СНК БССР. Сюды адносны: торфаб'яднаньне, мэталяб'яднаньне, аб'яднаньне будматар'ялаў, БелЭНЭРГА геолёгаразьведка, геадэзычнае кіраўніцтва, аб'яднаньне «Ўстаноўка» і Бел гарпрамаб'яднаньне. Сюды-ж уваходзяць прадпрыемствы саюзнага значэньня.

У сыстэму ўпаўнаважанага Наркамлесправу СССР уваходзяць: Лесбел, Белдрэў, Белхэмлес, Белпапертрэст, Лесаснабсбыт і трэст па сплаве.

Разбуйненьнем ВСНГБ зьяўляецца важным крокам у галіне паляпшэньня работы прамысловасьці, па наладжваньні канкрэтнага дыфэрэнцыяванага кіраўніцтва прадпрыемствамі.

Нельга забываць, што недавыканань по прамысловасьцю сваіх прамфінпляна ў у пэўнай ступені тлумачылася, побач з іншымі прычынамі, і сур'ёзнымі недахопамі ў рабоце апарату ВСНГБ, яго цяжкаважнасьцю, невыстарчальна выразным разьмеркаваньнем функцый паміж паасобнымі сэктарамі, слабым кантролем над выкананьнем дырэктыў.

Вядома, напрыклад, што ў апараце ВСНГБ кіраўніцтва такім важнейшым вучасткам работы, як укараненьне пачаткаў гаспадарчага разрахунку на фабрыках і заводах, было доўгі час зусім абязьлічаным, спэцыяльныя работнікі па гэтай галіне адсутнічалі ў найбольш адказны момант, як раз тады, калі новыя накіраўкі да крэдытнай сыстэмы пачыналі праводзіцца ў жыцьцё.

Паралелізм і недагаворанасьць існавалі ў рабоце сэктароў кадраў і эканомікі працы. У рэзультаце ў пытаньнях арганізаванага набору рабочай сілы для прамысловасьці пэўны пэрыяд існаваў значны самацёк.

Слабым вучасткам у рабоце апарату ВСНГБ да апошняга часу заставалася праверка выкананьня. Былі моманты, калі за самім апаратам накапліваліся дзесяткі нерэалізаваных пастаноў прэзыдыуму ВСНГБ. Аб невыстарчальнай рухомасьці апарату ВСНГБ гаварыць і буйныя перабоі, якія былі на БелДРЭС.

Разбуйненьне адкрывае самыя шырокія пэрспэктывы для ўзьняцьця якасьці работы апарату прамысловасьці, для згуртаваньня ўвагі на найбольш важным, асноўным, забясьпечвае набліжэньне гаспадарчых органаў да нізавых вытворчых адзінак.

Апараты лёгкай, цяжкай і лясной прамысловасьці, таксама, як і аб'яднаньні, атрымліваюць магчымасьць найбольш апэрацыйна і канкрэтна кіраваць далейшай перабудовай прамысловасьці на аснове шасьці ўмоў тав. Сталіна, узмацніць работу па выкананьні колькасных і якасных заданьняў.

Трэба хутчэй закончыць рэарганізацыю, разьмеркаваньне кадраў, забясьпечыць правільную расстаноўку сіл і сродкаў, не дапусьціць аслабленьня кіраўніцтва ў пэрыяд перабудовы.

Март месяц паказвае значнае парастаньне тэмпаў у рабоце прамысловасьці, набліжэньне да выкананьня вытворчых праграм (98,8 проц. па прамысловасьці, якая плянавалася ВСНГБ). Неабходны гэтыя тэмпы замацаваць і пэўхільна іх павышаць.

Барацьба за канкрэтнае кіраўніцтва павінна разгарнуцца па лініі правільнай арганізацыі працы на вытворчасьці, ліквідацыі абязьлічкі, устанаўленьня правільнай заработнай платы, зьнішчэньня ўраўнілаўкі, укараненьня гаспадарчага разрахунку, захаваньня жорсткай фінансавай дысцыпліны.

Праверка выкананьня — важнейшы бок канкрэтнага кіраўніцтва. Без дзейснага кантролю выкананьня немагчыма дабіцца ажыцьцяўленьня плянавых заданьняў.

Ва ўсю шырыню па-ранейшаму стаіць пытаньне далейшага ўмацаваньня адзінаначальня. Мы павінны сапраўды дабіцца таго, «каб шэфы аб'яднаньні перайшлі ад каллегіяльнага кіраваньня да кіраваньня адначаснага», каб дырэктар фабрыкі і заводу, загадчык цэху, майстар сталі сапраўднымі камандзірамі вытворчасьці. Гаспадарчыя, партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі павінны зрабіць усе неабходныя выводы з апошніх пастановы ЦК УсеКП(б) адносна Ніжагародзкага аўтазаводу.

Перамагаючы супраціўленьне апартуністычных элемэнтаў ажыцьцяўленьню пастаноў партыі аб разбуйненьні грамоздкіх гаспадарчых арганізацый, хутка перабудоўваючы апарат прамысловасьці на аснове баявых тэмпаў работы, на аснове канкрэтнага кіраўніцтва, на аснове адзінаначальня — дабіцца ў бліжэйшы-ж пэрыяд поўнага выкананьня прамфінпляну, пакрыем запазычанасьць першага кварталу.

Сустрэць 1 мая новымі перамогамі

У гэтым годзе сьвяткаваньне 1-га мая ў СССР будзе праходзіць пад знакам вялізарнейшых перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. 1931 год быў годам завяршэньня фундаманту сацыялістычнай эканомікі, быў годам пуску буйнейшых сацыялістычных гігантаў, годам далейшага ўздыму сацыялістычнай сельскай гаспадаркі і тэхнічнага ле ўзбраеньня.

Першы квартал 1932 году прынёс нам новыя перамогі. Рабочая кляса, пад кіраўніцтвам партыі Леніна, заваёўваючы ўсё новыя і новыя пазыцыі, перамагаючы супраціўленьне ідучых да дна капіталістычных элемэнтаў і іх агентаў — правых і «левых» апартуністаў, даб'ецца завяршэньня першай пяцігодкі ў чацвёртым 1932 г.

Працоўныя масы ўсіх народаў СССР выйдуць на першамайскую дэманстрацыю сружнай сям'ёй, згуртаванай адзінай мэтай—пабудаваць сацыялізм. Мы яшчэ раз прадэманструем перамогу ленінскай нацыянальнай палітыкі. Толькі дыктатура пралетарыяту змагла вырашыць нацыянальнае ва ўмовах капіталізму нацыянальнае пытаньне. Толькі ў шчырэйшай і бязьлітаснай барацьбе з шавінізмамі ўсіх масьцей і адценьняў, у перапуху чарту з ухілам у бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, нацыянальныя рэспублікі дасягнулі гігантскіх посьпехаў па ўсіх франтох і вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Над сьцягам Леніна, правяраючы ўкладзіны ленінскую нацыянальную палітыку, мы даб'емся ўсё новых і новых перамог на шляху пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

У капіталістычным сьвеце рабочая кляса будзе сьвяткаваць 1-га мая ў цяжкай абстаноўцы ўсё ўзрастаючага крызісу, росту беспрацоўя, ваеннай сьвістапляскі, правакацый і белага тэрору. У гэтай абстаноўцы яшчэ мацней прагучыць голас магільшчыка капіталізму: «Далоў імпэрыялістычную вайну і капіталізм, які яе параджае, няхай жыве бацькаўшчына працоўных усяго сьвету — СССР!».

Яшчэ больш ярка чым у мінулыя гады будзе ў 1-га мая акрэсьлена тое вялізарнае бяздоньне, якое ляжыць паміж капіталістычнай і сацыялістычнай сыстэмамі. З яшчэ большай пераканаўчасьцю і сілай будуць 1-га мая цяперашняга году выяўлены шляхі выхаду з крызісу зьвюма клясамі, якія змагаюцца. У той час, як капіталісты і іх лёкаі — сацыял-фашысты будуць заклікаць да вайны і інтэрвэнцыі супроць СССР, выпрабоўваючы сілу сваёй зброі на дэманструючых рабочых і сялянах, рабочая кляса выйдзе з лёзунгамі за СССР, за сусьветны Кастрычнік.

З нас, працоўных СССР — ударнай брыгады сусьветнага пралетарыяту — абстаноўка цяперашняга году патрабуе яшчэ большага напружаньня волі і энэргіі, яшчэ большага ўзмацненьня тэмпаў па ўсіх вучастках сацыялістычнай будоўлі, яшчэ большай арганізаванасьці і згуртаванасьці.

Сьвяткаваньне 1-мая ў гэтым годзе супадае з трэцяй гадавінай сацыялістычнага спаборніцтва. Гэта знамянальная дата павінна быць падкрэслена ва ўсёй рабоце, якая праводзіцца ў сувязі з падрыхтоўкай да 1-га мая, бо дзякуючы сацыялістычнаму спаборніцтву і ўдарніцтву рабочая кляса СССР «ператварыла працу з цяжкага і «зазорнага» ярма, якою яна лічылася раней (і якою яна лічыцца цяпер у капіталістычным сьвеце. — **Рэд.**), у справу гонару, справу славы, справу адвагі і геройства» (Сталін).

Мы выйдзем у гэтым годзе 1-га мая з паказам нашых дасягненьняў і перамог. Мы будзем дэманстраваць нашу магутнасьць і волю да перамогі 100-проц. выкананьнем прамфінпляну за першы месяц другога кварталу як па колькасных, так і па якасных паказьніках, пакрыцьцём «хвастоў», што засталіся ў першым квартале. Да гэтага павінны быць накіраваны ўсе нашы мерапрыемствы на падрыхтоўцы да 1-га мая.

Усе прадпрыемствы Беларусі павінны раўняцца па менскіх заводах «Бальшавік» і імя Варашылава, якія ўзялі на сябе абавязацельства — да 1-га мая скончыць пераразлікаваньне сацдагавораў паміж цэхамі, гаспадарча-разрахунковымі брыгадамі, агрэгатамі і асобнымі варштатамі. Зусім ясна, што толькі ўзьняцьцем сацспаборніцтва і ўдарніцтва на яшчэ большую вышыню мы даб'емся да 1-га мая тых посьпехаў, якіх чакае ад нас уся краіна і ўся міжнародная рабочая кляса.

Значна лепш і шырэй патрэбна правесьці падрыхтоўку да 1-га мая ў вёсцы. 25 красавіка канчаецца месячнік генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы. Значная частка раёнаў ужо распачала палявыя работы. Калгасы, саўгасы, МТС, аднаасобны сэктар дзень 1-га мая сустрэнуць новымі перамогамі на фронце барацьбы за выкананьне і перавыкананьне плянаў 3-ай бальшавіцкай сяўбы.

Таксама як і ў горадзе, права на ход у першай калёне павінна быць дана лепшай брыгадзе, лепшаму калгасу, лепшаму саўгасу. Барацьбу за атрыманьне гэтага права патрэбна разгарнуць у масавае спаборніцтва паміж асобнымі калгасьнікамі, брыгадамі і калгасамі.

Вялікую дапамогу вёсцы ў падрыхтоўцы да 1-га мая павінен аказаць горад шляхам пасылкі рабочых брыгад у падшэфныя сельсаветы і калгасы. Гэтыя брыгады павінны зьвяцца актыўнымі памочнікамі ў падрыхтоўцы і арганізацыі сяўбы і ў правядзеньні самога сьвяткаваньня 1-га мая.

Дзень 1-га мая — сьвята міжнароднай пралетарскай салідарнасьці — мы павінны адзначыць яшчэ большым узмацненьнем інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных мас.

Вялікае месца ў падрыхтоўцы да 1-га мая павінна заняць абарончая работа. Гэтага з асаблівай настойлівасьцю патрабуюць ад нас падзеі апошняга часу. Арганізацыі Асоавіяхіму павінны ва ўсю шырыню разгарнуць сваю работу, каб да 1-га мая ахапіць максымальную колькасьць рабочых. Асоавіяхім павінен па справе паказаць, што ён зьяўляецца сапраўдным рэзэрвам Чырвонай арміі.

Шырокай арганізацыйнай і масава-агітацыйнай работай падрыхтуем усё для таго, каб да 1-га мая дабіцца яшчэ больших перамог на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Адкрылася ўсебеларуская партыйная нарада па дарожным будаўніцтве

Учора ў Доме Камасьветы адкрылася ўсебеларуская партнарада па пытаньнях дарожнага будаўніцтва. З уступнай прамовай аб задачах нарады выступіў тав. **Гантман.**

На раніцнім пасяджэньні нарада заслухала 5 інфармацыйных дакладаў: тов. **Мудрагаленка** аб праграме дарожнага будаўніцтва на 1932 год і ходзе выкананьня яе, тав. **Сіманава** аб станоўішчы мэханізацыі работ, тав. **Тарасевіча** аб аўтатрэнспарце, тав. **Зайцава** аб конным трэнспарце і тав. **Кантона** аб становішчы забесьпячэньня рабочых на дарожным будаўніцтве.

На вечэрнім пасяджэньні пачаліся аб'яднаныя спрэчкі па ўсіх 5 дакладах.

18-ты дзень генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы

КАЛГАС „КАМБАЙН“ АДКАЗВАЕ ЎДАРНІКАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПАЛЁЎ КРЫМУ

ПА ПРЫКЛАДУ КРЫМСКІХ УДАРНІКАЎ КАЛГАСЫ БССР ПАВІННЫ ЗМАГАЦЦА ЗА СУСТРЭЧНЫЯ ТЭРМІНЫ СЯЎБЫ

Да ўсіх калгасьнікаў, рабочых і спэцыялістаў МТС і саўгасаў СССР)*

Таварышы!

Набліжаюцца дні, калі па ўсёй краіне Саветаў разгорнецца масавая калгасная і саўгасная сяўба. Посьпех трэцяй бальшавіцкай вясны забясьпечвае рост прадукцыйных сіл краіны, умацаваньне яе абароназдольнасьці, пераможнае ўступленьне СССР ў другую пяцігодку — пяцігодку пабудовы сацыялізму.

Крымская рэспубліка суцэльнай калектывізацыі 11 красавіка з посьпехам скончыла сяўбу збожжавых. Заданьні партыі і ўраду на 1932 г. па збожжы перавыкананы. Сяўба ў Крыме скончана на 20 дзён раней, чым у мінулым годзе. Гэтыя посьпехі, дасягнутыя КрымАССР, яшчэ раз пацьвярджаюць вялізарную перавагу буйнага сацыялістычнага зьмяроўства.

Мы, ударнікі саўгасаў, МТС і калгасаў Крыма, сабраліся на ўсекрымскім зьлёце для падвядзеньня вынікаў першага этапу веснавой сяўбы, праверкі выкананьня дагавору аб сацыялістычным спаборніцтве, заключанага з калгасамі Днепрапятроўшчыны, для вызначэньня далейшых шляхоў барацьбы за ўраджай і перадачы вопыту саўгасаў і калгасаў КрымАССР рэспублікам і абласьцям Савецкага Саюзу, якія ўступаюць у сяўбу ў бліжэйшыя дні.

Асноўным і вырашэльным посьпехам усёй сяўбы этапам зьяўляўся збор насеньня. КрымАССР першай у Савецкім Саюзе скончыла збор насенных фондаў. Фонды былі створаны да 20 лютага — раней тэрмінаў, устаноўленых урадам. Барацьба за насеньне ў Крыме была праведзена на аснове шырокага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва калгасаў. Адстаючыя раёны і калгасы браліся на грамадзкі буксір. У раёнах шырока была разгорнута сацыялістычная ўзаемадапамога калгасаў. Па ўсім Крыме неаднаразова рабіліся масавыя рэйды праверкі ходу барацьбы за насеньне, паскарэньня гатункаабмену і арганізацыі хаваньня насеньня.

Калгасныя і саўгасныя брыгады выпрашаюць посьпех сяўбы, і туды—у брыгаду — была перанесена праверка гатоўнасьці калгасаў і саўгасаў да вясны. Абвешчаны па Крыме агляд калгасных брыгад быў праведзен, як шырокая палітычная кампанія, якая ўзьняла калгасныя масы на барацьбу за правільную арганізацыю працы. Быў арганізован шырокі паказ узораў, разгорнута прапаганда вытворчага прынцыпу арганізацыі калгаснай брыгады, шырока ўскраваліся і разтлумачаліся скайзеньні і памылкі. На прыкладах такіх калгасаў, як «Фрыш-Анс-Верк» і імя Карла Маркса, Біюк-Акларскага раёну, «Інкпаб», Сейтлерскага раёну, і інш., правільна арганізаваўшых працу, калгасы Крыму вучыліся, як трэба рыхтавацца да сустрэчы бальшавіцкай вясны.

Правільна арганізаваныя і свячасова падрыхтаваныя да сяўбы калгасныя вытворчыя брыгады забясьпечылі посьпех сяўбы. Брыгады атрымалі пэўныя і пастаянны склад людзей, інвэнтар і цягавую сілу. За брыгадамі былі замацаваны пэўныя вучасткі, за ўраджай якіх кожная брыгада адказвае. Шырока разгорнутыя вытворчыя нарады брыгад, брыгадныя насьцянгазэты, агляды калгасаў, праведзеныя друкам, дапамагалі на-ходу зжываць недахопы ў падрыхтоўцы да вясны. Дзякуючы правільнай арганізацыі калгасных брыгад, падбору брыгадзіраў і іх падрыхтоўцы, Крым у гэтым годзе ўступіў у сяўбу непараўнальна больш падрыхтаваным, чым гэта было ў мінулым годзе.

Якасьць—наш лёзунг

Для КрымАССР звычайным лічылася праводзіць сяўбу на працягу 25-30 дзён. Пад кіраўніцтвам партарганізацыі Крым здолеў зламіць гэтыя традыцыі, і, як правіла, сяўба ў калгасах і саўгасах Крыма працягвалася 8-10 дзён.

Посьпех быў забясьпечан разгорнутай барацьбой за перавыкананьне норм выпрацоўкі на аснове сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. У калгасе «Вілор», Ішуньскага раёну, ударнікі дабіліся выпрацоўкі ў 3 гэктары на адзін конны букер. Гэту норму выпрацоўкі калгас утрымаў на працягу ўсёй сяўбы. У калгасе «Памяці Ільліча», Сейтлерскага раёну, прадукцыйнасьць букера складала 2,7 га; у калгасе «Ленінець», Сімфэропальскага раёну, — 2,8 га. У некаторых калгасах прадукцыйнасьць на букер была вышэй 3 га. Калгасаў, якія рэзка павысілі прадукцыйнасьць працы ў веснавую сяўбу, было вельмі шмат.

Узор ударнай работы паказалі многія рабочыя крымскіх саўгасаў і МТС. Яркія прыклады ўдарнай працы далі трактарысты саўгасаў «Сортсемтрэсту», «1-га мая», Фрайдорфскага раёну. Тут камсамольцы Молюк, Аркан, Цімафееў, Папоў і Нецесін замест 13 га высявалі 20-21 га, поўнасьцю выконваючы якасныя паказьнікі. Трактарыст-ударнік Руднёў паводле нормы павінен быў выпрацоўваць 15 га за рабочы дзень, а дабіўся — 23 га.

Пасеўная кампанія праходзіла пад лёзунгам барацьбы за якасьць сяўбы, за поўнае выкананьне патрабаваньняў агратэхнікі, за ператварэньне КрымАССР у рэспубліку перадавой агратэхнікі. Праведзеныя ў лютым ва ўсіх раёнах аграканфарэнцыі і потым дэкаднікі давядзеньня агрэпатрабаваньняў да кожнага калгасьніка, праведзеныя ў асноўных збожжавых раёнах — Еўпаторыйскім, Джанкойскім і Ленінскім, спрыялі павышэньню якасьці працы ў калгасах і саўгасах. Па выкліку калгасьнікаў Еўпаторыі па Крыме стварэліся інспэкцыі якасьці ў калгасных брыгадах. Калгасны друк Крыму пераключыўся на прапаганду ведаў агратэхнікі. Рабочыя саўгасаў і калгасьнікі рашуча выкрывалі зрыўшчыкаў якасных заданьняў бальшавіцкай вясны. Так, у Сімфэропальскім збожжавым саўгасе было зьмянена кіраўніцтва, якое патурала зрыву агрэпатрабаваньняў у вядзеньнях.

Барацьбой за ўкараненьне агратэхнікі былі пранізаны ўсе этапы падрыхтоўкі і практычнага правядзеньня сяўбы. Усё насеньне было ачышчана і пратраўлена, увесь пасеў рабіўся гатунковым збожжам. Былі няўхільна выкананы патрабаваньні радавога пасеву, лепшай якасьці задзелкі насеньня і г. д. Падрыхтоўка зямлі пад пасевы, ачыстка палёў ад пустазельля зьяўляліся важнейшым этапам барацьбы за ўраджай. Сяўба праводзілася выключна дням, а ноччу — узорваньне. Была разгорнута рашучая барацьба са спробамі сеяць у начны час, што не забясьпечвае якасьці пасеву.

Высокая тэхнічная ўзброенасьць сельскай гаспадаркі Крыму, якая вымяраецца тым, што на кожныя 40 двароў, аб'яднаных зараз у калгасы і якія абслугоўваюцца МТС, прыпадае адзін трактар, патрабавала разгорнутай барацьбы за стварэньне кадраў, уладаючых навейшай тэхнікай. Зімой ва ўсіх раёнах Крыму, у калгасах, саўгасах і МТС узмоцнена вялася падрыхтоўка трактарыстаў, брыгадзіраў і рабочых іншых спэцыяльнасьцяй. Пры гэтым асаблівая ўвага была зьвернута на якасьць кадраў, якія выпускаюцца. Курсамі трактарыстаў па сыстэме Трактарацэнтру было ахоплена звыш 2.000 рабочых, а па саўгасной сыстэме — да 1.500. На курсах брыгадзіраў навучалася некалькі тысяч калгасьнікаў, а ўсяго гурткамі, курсамі і іншымі формамі вучобы было ахоплена да 20.000 рабочых і калгасьнікаў масавых кваліфікацый.

Сустрэчныя лічбы

Барацьба за посьпех бальшавіцкай вясны праходзіла на аснове шырокага разгортваньня форм сацыялістычнай працы. Сустрэчнае плянаваньне атрымала шырокае распаўсюджваньне ў практычнай рабоце брыгад, у калгасах і саўгасах. На вытворчых нарадах абмяркоўваліся нормы выпрацоўкі і высоўваліся сустрэчныя лічбы. Так, напрыклад, у Біюк-Анларскім раёне у большасьці калгасаў былі прыняты нормы ў 3 га на букер. Рознастайныя формы масавай работы — рэйд праверкі гатоўнасьці да вясны, агляды саўгасаў і калгасаў, мітынг бавўнянай зямлі; шырокае разгортваньне новых форм работы друку—арганізацыя брыгадных насьцянгазэт, у прыватнасьці выкарыстаньне вопыту Паўночнага Каўказу па выданьні макетаў насьцянгазэт, аглядавыя рэдакцыі ў саўгасах і калгасах; шырока разгорнутая агітацыйная і прапагандысцкая работа партарганізацыі на вёсцы, — усё гэта спрыяла павышэньню актыўнасьці калгасных мас і рабочых саўгасаў і МТС і пераможнаму выкананьню задач пасеўнай.

Перадавыя калгасы па сваёй ініцыятыве аказвалі дапамогу калгасам, якія пры ўсім напружаньні не маглі справіцца з сяўбой уласнымі сіламі: арганізоўваліся грамадзкія буксіры, пасылаліся падмацаваньні сродкамі вытворчасьці і г. д. Як у пэрыяд падрыхтоўкі, так і ў пэрыяд самой сяўбы аддавалася значная ўвага і аднаасобнаму сэктару.

Барацьба за аўладаньне тэхнікай самым цесным чынам зьвязана з праблемай прадукцыйнасьці працы. Мы слаба яшчэ аўладоўваем тэхнікай трактараў. Па радзе МТС і саўгасаў прастой трактараў дасягалі ад 30 да 50 проц. рабочага часу. У калгасе імя Варашылава, Сейтлерскага раёну, выконвалі толькі 0,75 га на букер. Вельмі шкодзіла палявым работам нізкая якасьць рамонту трактарнага парку. У Біюк-Анларскай МТС з 6 трактараў, працаваўшых на 6-м вучастку, да пачатку вясны 5 пайшлі на паўторны рамонт. У Семі-Калодзязянскай МТС у разгар сяўбы выбылі са строю 15 трактараў. Нізкая якасьць рамонту часам прыводзіла да таго, што трактар выпрацоўваў менш, чым конны букер. Так было, напрыклад, у Ішуньскай МТС. Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што барацьба за аўладаньне тэхнікай зьяўляецца баявой задачай калгасьнікаў Крыму, рабочых МТС і саўгасаў. Гэтыя факты патрабуюць лепшай пастаноўкі рамонту машын, штодзённага тэхнічнага інструктаваньня на-ходу, арганізацыі палявога рамонту ў саўгасах і МТС.

Яшчэ далёка не ва ўсіх саўгасах і калгасах Крыму ўсьвядомлена рашаючае значэньне агратэхнікі ў барацьбе за дасягненьні высокай таварнасьці ў калгасах і саўгасах. Асобныя калгасы, напрыклад, калгасы в. Кішлаў, Красна-Крымскага раёну, адносіліся з пагардай да патрабаваньняў высокай якасьці сяўбы, сеялі недачышчаным збожжам, у пагоні за колькасьцю забывалі аб якасьці. У саўгасах «Хан-Эліі» і «Цэрэклы-Камрат» былі дапушчаны яўныя парушэньні загаду Наркамзему СССР. Змагаючыся за колькасьць, у гэтых саўгасах пачалі сеяць ноччу. Па такіх спробах, якія падрываюць барацьбу за ўраджай, быў нанесен рэзкі ўдар.

Буйныя недахопы ёсьць яшчэ ў арганізацыі працы ў калгасах. Ва многіх калгасах і саўгасах яшчэ захаваліся абязьлічка і ўраўнілаўка з усімі адмоўнымі вынікамі. У саўгасах яшчэ невыстарчальна праведзена перабудова, якая патрабуе ўмацаваньня аддзяленьня, як асноўнага зьвяна. Разгорнутая барацьба за поўную рэалізацыю ўказаньняў тав. Сталіна зьяўляецца баявой задачай саўгаснага і калгаснага Крыму.

У барацьбе з кулаком і апартуністамі кавалася перамога

Трэцяя бальшавіцкая вясна ў Крыме праходзіла ва ўмовах жорсткага супраціўленьня рэштак кулацтва і яго агентуры. Клясавыя ворагі і іх дапаможнікі прабавалі сарваць правядзеньне сяўбы ў максымальна сьціслых тэрміны. «Рана сеяць ня трэба, пачакаем, пасьпеем», гэтыя настроі прабавала проціпаставіць кулацтва лініі партарганізацыі Крыма. Партарганізацыя змагла выкрыць хітрыкі клясавых ворагаў і мабілізаваць масы на выкананьне заданьняў вясны ў максымальна сьціслыя тэрміны. Мелі месца спробы сарваць рэалізацыю ўказаньняў ЦК ад 4 лютага. Апартуністы з Балаклаўскай МТС заявілі, што гэтыя ўказаньні «ва ўмовах Балаклаўскага раёну не падыходзяць» і што для гэтага раёну вытворчы прынцып не абавязковы.

Гэтай вясной узьнялі галаву і «леваківі». У Біюк-Анларскім раёне кіраўніцтва МТС адміністрацыйным шляхам прабавала правесьці зьліцьцё калгасаў. У прыгарадных сельсаветах Феадосіі прабавалі заняць лінію на ўзбуйненьне калгасаў. У Сімфэропальскім і Ішуньскім раёнах мелі месца грубыя скажэньні лініі партыі ў ўграмадзяньні жывёлы. Посьпехі трэцяй бальшавіцкай вясны былі забясьпечаны няўхільнай барацьбой партарганізацыі з клясавым ворагам і апартунізмам на два фронты.

Таварышы, калгасьнікі, рабочыя, спэцыялісты МТС і саўгасаў!

Рабочыя, работніцы і інжынэрна-тэхнічны пэрсанал маскоўскага аўтамабільнага заводу імя тав. Сталіна зьвярнуліся да ўсіх рабочых і работніц і калгасьнікаў Савецкага Саюзу з прапановай адзначыць 8-ю гадавіну артыкулу Леніна аб сацыялістычным спаборніцтве арганізацыяй масавых грамадзкіх агляданў сацыялістычнага спаборніцтва.

Прасякнуўшы з дапамогай рабочых у вёску ідэя сацыялістычнага спаборніцтва была падхоплена рабочымі саўгасаў і мільённымі масамі калгасьнікаў. Спаборніцтва стала магутным рухавіком сацыялістычнага зямляроўства.

Сабраўшыся на ўсекрымскі зьлёт для падвядзеньня вынікаў сяўбы збожжавых, мы, па-бальшавіцку выкрыўшы недахопы кампаніі і намеціўшы чарговыя задачы барацьбы за ўраджай, прымаем выклік рабочых заводу імя Сталіна і заклікам пасьледаваць нашаму прыкладу ўсіх рабочых і калгасьнікаў Савецкага Саюзу.

Пачаўшы веснавую сяўбу масавым паходам супроць прагульшчыкаў і гультаёў, арганізуючы ўдарныя брыгады, узбройваючыся вопытам усіх форм сацыялістычнага спаборніцтва, рабочыя саўгасаў і МТС і калгасьнікі Крыма пасьпяхова справіліся з задачай пасеву ранніх збожжавых.

Зараз мы разгортваем барацьбу за выкананьне заданьняў чорнапаравой кампаніі і выкананьне пляну па тэхнічных, спэцыяльных і прапашных культурах. Мы ўпэўнены, што зможам выканаць гэтыя задачы яшчэ больш пасьпяхова, чым справіліся з сяўбой раньніх збожжавых. Гэтаму зарука — высокі энтузіязм мас калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і МТС Крыма, магутнае разьвіцьцё сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, цьвёрдая рашучасьць ва што-б там ні стала выканаць адказнейшыя задачы заключнага году пяцігодкі.

Таварышы рабочыя саўгасаў, МТС і калгасьнікі!

Арганізуйце грамадзкі агляд сацыялістычнага спаборніцтва. Выкрыем і ачысьцім свае рады ад інжэўдарнікаў. Яшчэ шырэй разгорнем сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, узьнімем яго на больш высокую ступень. Арганізуем новыя ўдарныя брыгады імя 3-й гадавіны сацспаборніцтва. Праверым, як пастаўлен улік работы ва ўдарных брыгадах, наколькі яны праводзяць у жыцьцё 6 умоў тав. Сталіна. Умацуем брыгадны гаспадарчы разрахунак, укаранім яго там, дзе ён яшчэ ня ўведзен.

Мы заклікаем вас, таварышы калгасьнікі, рабочыя і спэцыялісты саўгасаў і МТС Савецкага Саюзу выкарыстаць вопыт барацьбы Крыма за сацыялістычны ўраджай, баявым выкананьнем задач пасеўнай умацаваць пазыцыі сацыялізму ў нашай краіне, забясьпечыць яе высокую абароназдольнасьць, ператварыўшы кожны калгас і саўгас у баявую крэпасьць Савецкага Саюзу.

За бальшавіцкі посьпех саўгаснай і калгаснай вясны.

За высокую прадукцыйнасьць і якасьць працы на сацыялістычных палёх. За пераможнае выкананьне задач заключнага году пяцігодкі.

ПОДПІСЫ КАЛГАСЬНІКАЎ.

*) Ліст калгасьнікаў Крыму быў зьмешчан у газэце «Правда» ад 16 красавіка г. г.

ПРАВЯДЗЕМ СЯЎБУ ЗА 20 УДАРНЫХ ДЗЁН

СЛУЦАК. (Сьпешн. поштай).

Паляводчая брыгада № 1 калгасу «Камбайн», абмяркоўваўшы на сваёй вытворчай нарадзе ліст калгасьнікаў-ўдарнікаў Крыму, надрукаваны ў «Правде» ад 16 красавіка, пастанавіла зьвярнуцца праз «Зьвязду» да ўсіх калгасьнікаў БССР з наступным лістом:

— Мы горача вітаем крымскіх ударнікаў палёў, якія заклікаюць скарыстаць іх вопыт барацьбы за 3-ю бальшавіцкую сяўбу. Нашы таварышы—ўдарнікі Крыму зусім правільна ставяць пытаньне, што баявым выкананьнем задач бягучай веснавой пасеўнай кампаніі мы яшчэ больш умацуем пазыцыі сацыялізму ў нашай краіне, цьвёрда забясьпечым яе абароназдольнасьць, ператварыўшы кожны калгас і саўгас ў наступную крэпасьць Савецкага Саюзу.

Наша паляводчая брыгада, якая складаецца з 15 мужчын і 20 жанчын, мае такое заданьне: засеяць 1 ўбраць 25 га бульбы, 23 га аўса з падсевам канюшыны, 10 га ячменю, 5 га ільну. Апрача таго мы павінны ўбраць 13 га канюшыны, 57 га сенажаці і 33 га азімага жыта.

Мы ставім перад

Масава-выхаваўчую работу—на вышэйшую ступень

Задачы, пастаўленыя XVII усесаюзнай партканферэнцыяй, патрабуюць ад кожнай партыйнай арганізацыі, асабліва ад нізавых партыйных зьвеньняў (цэхавыя ячэйкі, партгрупы) максымальнай увагі выхаванню шырокіх рабочых мас, «даючы бязьлітасны адпор супраціўленню гінучых капіталістычных элемэнтаў, перамагаючы буржуазныя і дробна-буржуазныя забабоны сярод працоўных»... (з пастановы XVII партканферэнцыі). Нізавыя партыйныя зьвеньні, у якіх канцэнтруецца асноўны цяжар партыйнай работы, павінны значна ўзмацніць работу па давядзеньні да шырокіх колаў працоўных лёзунгаў партыі і на аснове растлумачэньня іх узбройваць працоўныя масы ўпэўненасьцю ў перамозе сацыялізму.

Выключнае месца ў справе ажыцьцяўленьня гэтай задачы займае разгортваньне штодзённай агітацыйнай работы ў нізавых зьвеньнях вытворчасьці, правільна арганізаваны і праведзены партыйны дзень. Задача кожнай вытворчай партарганізацыі заключаецца ў тым, каб забясьпечыць актыўны ўдзел на агульных сходах партыйных груп, цэхавых ячэек і парткалектыву, беспартыйных рабочых, вывучаць іх настроі і запатрабаваньні і разгортваць скрозь іх глыбокую растлумачальную работу аб палітыцы партыі ў розных галінах сацыялістычнага будаўніцтва, кырока папулярызуючы важнейшыя партыйныя рашэньні.

Азнаямленьне з пастаноўкай партыі на масавай работы на некаторых прадпрыемствах Менску сьведчыць аб тым, што ў гэтым напрамку справа стаіць далёка не на належнай вышыні. У цэхах заводу **«Камунар»** партыйныя ячэйкі амаль зусім не займаюцца культурна-выхаваўчай работай, за правядзеньне якой на заводзе ніхто не адказвае. Вылучаныя заўсюдныя культработнікі вельмі часта мяняюцца і фактычна не працуюць. На заводзе ёсьць партгабінэт, які выкарыстоўваецца выключна для... правядзеньня рэпэтыцый драмгуртка. Біраўнікі партгабінэту да гэтага часу не распачалі яшчэ падрыхтоўкі да 1-га мая.

Бюро парткалектыву і цэхавыя ячэйкі зусім мала аддаюць увагі прыцягненьню да ўдзелу ў партыйных сходах беспартыйных рабочых. На агульным сходзе парткалектыву (17 красавіка), дзе абгаварвалася пытаньне аб выніках апошняга пленуму ЦК КП(б)Б, пры сутнічала толькі 30-40 беспартыйных рабочых, прычым амаль ні адзін з іх ня прыняў актыўнага ўдзелу ў абгаворэньні вынікаў пленуму. Гэта тлумачыцца тым, што парткалектыў і цэхавыя ячэйкі, як правіла, не займаюцца падрыхтоўкай да правядзеньня партдня ў нізавых зьвеньнях вытворчасьці, час для правядзеньня сходаў не прыстасоўваецца да вытворчых і бытавых умоў рабочых.

Нельга абыйсьці таго факту, што на «Камунары» ёсьць яшчэ больш 10 пісьменных рабочых, палова з якіх не наведвае лікпунктаў.

Значна лепш пастаўлена масавая работа на абутковай фабрыцы. Кожны партарганізатар мае ад бюро цэхавай ячэйкі канкрэтныя заданьні аб разгортваньні выхаваўчай работы ў сваёй брыгадзе, выкананьне якіх сыстэматычна правяраецца. Усе важнейшыя дырэктывы партыі пасьля абгаварэньня іх на партактыве прадпрыемстваў распрацоўваюцца на сходах партыйных груп і цэхавых ячэек. Перад кожным партыйным-групавым, цэхавым, або агульным-сходам апрача абвестак і плякатаў партарганізатары за некалькі дзён да сходу апавяшчаюць у сваіх брыгадах аб зьмесьце парадку дня гэтых сходаў. Усё гэта забясьпечвае амаль 100 процантнае наведамленьне беспартыйнымі рабочымі партыйных сходаў і іх актыўны ўдзел у правядзеньні гэтых сходаў.

Улічыўшы гэты вопыт, вытворчыя партарганізацыі Менску павінны значна павялічыць увагу ў справе разгортваньня высокай якасьці растлумачальна-агітацыйнай работы, ліквідаваць у правядзеньні яе абязьлічку, прыстасоўваючы яе да канкрэтных умоў кожнага вытворчага вучастку свайго прадпрыемства.

Ф. і М.

ЛІСТ НЯМЕЦКІХ РАБОЧЫХ ВЫКЛІКАЎ ТВОРЧЫ УЗДЫМ СЯРОД ЧЫГУНАЧНІКАЎ БССР

Адозва нямецкіх вагона-рамонтных рабочых да чыгуначнікаў СССР выклікала масутную хвалю энтузіязму сярод гомельскіх чыгуначнікаў. Адозва шырока прапрацавана па агульных сходах рабочых Гомельскага вузла, рабочых вагавага цэху і г. д.

Чыгуначнікі горача вітаюць сваіх братоў па клясе — нямецкіх чыгуначнікаў, якія ўважліва сочаць за пераможным будаўніцтвам у СССР і гатовы ў любую хвіліну імпэрыялістычную вайну і інтэрвэнцыю супроць СССР, якая арганізоўваецца драпежнікамі сусьветнага капіталу, ператварыць у грамадзянскую вайну.

Гомельскія чыгуначнікі адказалі нямецкім таварышам узьцьцем на сабе канкрэтных сацыялабяздзельстваў па выкананьні і перавыкананьні праграмы.

Рабочыя Гомельскага дэпо вызначылі рад мерапрыемстваў па сваячасовым выпуску з рамонту паравозаў, сваячасовай падачы паравозаў пад цягнікі і сьледваньні цягнікоў, паводле раскладу. На працягу бліжэйшых дзён ухвалена канчаткова перабудаваць работу вытворчых нарад з тым, каб наблізіць яе да шырокіх мас чыгуначнікаў, шляхам 100 проц. ахопу рабочых адпаведнай галіны работы. На аснове гаспадарчага разрахунку дабіцца мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, узьняцьця прадукцыйнасьці працы і г. д.

Рабочыя вагоннага цэху ў сувязі з распрацоўкай ліста нямецкіх таварышоў, пастанавілі: зьнізіць да мінімуму процант хворых вагонаў, дабіцца 100 проц. ушчыльненьня рабочага дня, не дапусьціць ніводнага выпадку парушэньня працыцыплыны; лепш наладзіць сувязь з замежнымі рабочымі; узмацніць культмасавую, выхаваўчую, інтэрнацыянальную работу і інш.

Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі гомельскія чыгуначнікі ліквідуюць адставаньне, якое ёсьць на асобных вучастках работы.

Н. Гафт.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ПА ЯКАСЬЦІ ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

ВОПЫТ ПЕРАДАВЫХ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА ЯКАСЬЦЬ ПЕРАНЕСЬЦІ НА ЎСЕ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ХАРЧОВАЙ ІНДУСТРЫІ

Вітаем ударнікаў харчавікоў

Прэзыдыум Цэнтральнага Камітэту саюзу рабочых сельпрому СССР, на даючы выключнае значэньне задачы паляпшэньня якасьці харчовай прадукцыі, вітае ў асобе дэлегатаў усебеларускай канфэрэнцыі па якасьці, цьвёрдую волю рабочых-харчавікоў выканаць баявыя заданьні партыі і ўраду.

Прэзыдыум спадзяецца, што канфэрэнцыя па-баявому вырашыць рад пытаньняў, зьвязаных з карэнным паляпшэньнем прадукцыі прадпрыемстваў Сельпрому (тытунь, дрожджы, патака, піва, безалькагольныя напіткі), што вопыт барацьбы за якасьць перадавых заводаў БССР, выяўлены канфэрэнцыяй, стане здабыткам усіх нашых заводаў і фабрык, раскінутых на вялізарнай тэрыторыі Савецкага Саюзу.

КАНФЭРЭНЦЫЯ ПАВІННА ЗЬЯВІЦЦА ФАКТАРАМ, МАБІЛІЗУЮЧЫМ РАБОЧЫЯ МАСЫ НА БАРАЦЬБУ ЗА ЯКАСЬЦЬ. Яна павінна паслужыць магутным штуршком да ліквідацыі абязьлічкі ў браку, да ўстанаўленьня сыстэмы матар'яльнай адказнасьці за якасьць прадукцыі, да арганізацыі масавага кантролю рабочых над якасьцю работы.

ЦК саюзу рабочых Сельпрому—Г. П. ЕМЕЦ.

Абязьлічка браку і тэхнічныя непаладкі—прычыны дрэннай якасьці

Гомельскі камбінат **«Спартак»** мае вельмі вялікае значэньне ў сыстэме кандытэрскай прамысловасьці БССР. Удзельная вага яго прадукцыі складае 33 % у адносінах да ўсёй прадукцыі кандытэрскіх фабрык БССР. У чацьвертым заключным годзе пяцігодкі камбінат павінен выпусьціць кандытэрскіх вырабаў на суму 19.865 тыс. руб. супроць 13.925 тыс. руб. у мінулым годзе.

У першым квартале 1932 году камбінат выпрацаваў розных кандытэрскіх прадуктаў—2.657 тон, што складае 101,1 проц. квартальнага плану.

Паасобныя гаспадарча - разрахунковыя брыгады і ўдарнікі камбінату паказваюць сапраўдныя ўзоры таго, як трэба змагацца за паляпшэньне якасьці прадукцыі. Да гэтых брыгад адносіцца брыгада тав. **Каранеўскага** (карамельны цэх), якая выканала прамфінплян на 105,3 проц. і зьнізіла брак да 1,2 проц. супроць плянавых 3 проц.; брыгада тав. **Рэйсіна** — выканала прамфінплян па 112,8 проц., давяла брак да 0,92 проц.; брыгада **Вайсмана** — выканала прамфінплян на 121,7 проц., давяла брак да 1,1 проц.; брыгада **Глухаза** — выканала прамфінплян на 117,8 проц., зьнізіла брак да 2,02 проц.

Ударная брыгада гомельскага кандытэрскага камбінату **«Спартак»**: Сычова, Бэнцыянава, Лейкіна і Ліпкіна.

Лепшымі ўдарнікамі зьяўляюцца таксама т. т. **Гурэвіч, Сычова, Бэнцыянава, Ліпкіна, Журбік, Падзойская** і інш.

Але-ж лепшы вопыт барацьбы паасобных брыгад і ўдарнікаў за якасьць прадукцыі не перанесен ва ўсе цэхі і брыгады. Выключна дрэнная работа бракеражу, слабая ўвага трыкутніку да якасьці прадукцыі, абязьлічка ў выпуску браку — вось прычыны выпуску дрэннай прадукцыі паасобнымі цэхамі і рабочымі. Брак у мяккім цэху дасягнуў у першым квартале 14,8 проц. да ўсёй выпушчанай прадукцыі, а па карамельным — 2,8 проц. З-за абязьлічкі нельга выявіць, хто зрабіў брак, усе сьляды захаваны.

Бракоры яшчэ не ўсьвядомілі тэй адказнай ролі, якую яны павінны адыграць у барацьбе за якасьць. Бракеры **Басіна і Пугач** (карамельны цэх) часта бяруць лад сваю абарону паасобных рабочых, якія робяць брак, і нават адміністрацыю цэху спасылаючыся на «аб'ектыўныя прычыны».

Для зьнішчэньня недахопаў у выпуску прадукцыі, трэба, па-першае, увесьці сыстэму ярлычкоў з паказам — хто здае, прымае, пакуе прадукцыю, — гэта ўадыме адказнасьць за работу і дасьць магчымасьць ліквідаваць абязьлічку ў браку. Трэба карэнным чынам палепшыць склад бракераў за лік вылучэньня лепшых ударнікаў. Трэба прыняць неадкладныя меры да канчаткова ліквідацыі вытворчых непаладкаў.

Нядаўна на камбінаце быў праведзен масавы рэйд ударнікаў, у якім прымала ўдзел 40 чал. Рэйд выявіў, што няма ніякіх «аб'ектыўных прычын», якімі-б можна было апраўдаць выпуск дрэннай прадукцыі, што толькі пры ўмове належнай увагі да пытаньня якасьці работы з боку партыйных, прафэсіяльных арганізацый камбінату можна дабіцца пералому ў гэтай справе.

Н. Г.

Як нельга хаваць харчовыя прадукты

Што выявіў рэйд па крамах

Брыгады з рабочых фабрыкі «Камунарка», работнікаў «Зьвязды» і Наркамснабу правялі нядаўна рэйд па праверцы становішча з хаваньнем харчовых прадуктаў на складах крам ЦРК і іншых гандлёвых арганізацый. Рэйд выявіў даволі сумны малюнак, які сьведчыць аб тым, што работнікі прылаўку не аддаюць належнай увагі пытаньню якасьці прадукцыі.

Тав. **Эпштэйн**—лепшая ўдарніца па якасьці—работніца мякка-шакаладнага цэху фабрыкі «Камунарка».

Напрыклад, у **краме Белгандлю № 1** цукеркавыя вырабы ляжаць у вільготным месцы. Былі выпадкі, калі з-за дрэннай тары і нездавальняючай забойкі скрынь цукеркі псаваліся.

У кладоўцы **крамы № 1 ЗРК мэталістаў** мяшкі з крупамі і цукрам прыціснуты да сырой сьценкі і псуюцца. Каля мяшкоў з цукрам і крупамі стаіць бочка з мылам, якая цячэ, ад кае мыла пападае пад мяшкі з цукрам і крупамі. Макароны ляжаць у вільготных скрынях. Мяшкі з дзіцячымі сухарамі стаяць адкрытымі і ўвесь пыл і павуціна кладуцца на сухары. Ня лепшая пастаноўка хаваньня тавараў і ў самой краме. У адкрытае начыньне, дзе знаходзіцца алей, трапляюць кавалкі паперы і ўсякае сьмяцьцё.

У краме **ЗРК заводу імя Молатава** ў скрынках, прызначаных для круп і мукі, паклалі боты. Начыньне з-пад масла недапушчальна брудпае. Нядаўна прыбылі крупы ў мокрых мяшках. Яны ляжаць пакуль, як кажа загадчык крамы **Усналоўскі**, «высахнуць».

У **ЗРК друкароў** маргарын пакладзен у зламаныя бочкі.

Наогул, работнікі гаркому каапэрацыйна-гандлёвых служачых фармальна ўключыліся ў падрыхтоўку і праведзеньне кампэраніі. Прадстаўнік гарадзкога камітэту тав. **Аксэльрод**, які ўключан у штаб, ніякага ўдзелу ў рабоце ня прымае і зусім няўважліва адносіцца да рэйду, кіраўніцтва якім яму было даручана.

Брыгада «Зьвязды», Наркамснабу і фабрыкі «Камунарка»: З. Левін, Г. Дашкевіч, Шыманская, Ліпкін, Юрэзіцкая, Шатройка, Кацовіч, Верамейчык, Раткевіч, Лазавік, Сасноўская, Казлова, Абрамовіч, Дубавік, Дзятковіч, Гайлер, Капялевіч.

ДАБІЦЦА РАШАЮЧАЙ ПЕРАМОГІ У ІЛЬНАЗАГАТОЎКАХ

ВУШАЧЫ.

На працягу амаль 3-х месяцаў процант загатовак ільнавалакна стаіць на адным пункце — 42 %. Адзін час райснаб у сваіх зводках паставіў 43 проц., але праз пяцідзеўку зноў зьнізіў да 42 проц. Характэрна, што гэты процант не мяняецца нават пры паступленьні (хоць зусім слабым) валакна ад паасобных калгасаў. Хочуць гэтага кіраўнікі Загацільну, ці не, але падобныя факты нагадваюць сіроцінскую гісторыю, аб якой ня так даўно паведамлялася ў «Зьвязьдзе».

Ясна, што і ў даным выпадку не абыйшлося без майстраваньня зводак з мэтай «втереть очки».

Райком КП(б)Б праходзіць міма гэтых фактаў.

Даволі сказаць, што па інструкцыйнай нарадзе ўпаўнаважаных райкому па сельсаветах, якая гэтымі днямі ад былася, гаварылі аб усім, але толькі не аб загатоўках ільну. Абышлі гэта пытаньне і па раённым партыйным сходзе 10 красавіка.

Райснаб, Загатлён, райкалгасаюз, МТС таксама займаюцца «больш важнымі» пытаньнямі. Падрыхтоўка да сяўбы не ўвязваецца з загатоўкай. Наадварот, іменна сяўбу ў Вушачах лічаць прычынай недапушчальнага аслабленьня тэмпаў загатовак ільнавалакна.

Член праўленьня райкалгасаюзу **Сянькевіч** ад імя кіраўніцтва заявіў: «Нічога ня робім і рабіць ня будзем, бо няма часу».

Нічога ня робячы для таго, каб фарсаваць пераапрацоўку трасты, ня прымаючы мер да тых кіраўнікоў калгасаў, якія разбазарваюць валакно, работнікі райкалгасаюзу, такім чынам, сталі на шлях сьвядомага недавыкананьня плянаў.

Чаго варты, напрыклад, той факт, што старшыня калгасу **Жалейка**, які захаваў 240 кгр. добраякаснага ільнавалакна, застаўся непакараным.

У раёне наогул спынілі барацьбу за апрацоўку валакна. Работнікі райкалгасаюзу і кіраўнік Загатільну **Кяткі** лічаць, што «лён увесь апрацован, але...». Гэтае «але» яны расшыфроўваюць літаральна так: валакно, або прадаецца калгасьнікамі, або (?) здана дзяржаве.

А між тым, ва многіх мясцох лён ляжыць неапрацаваным, валакно разбазараецца, раскрадваецца, выкарыстоўваецца на рознага роду «мясцовыя патрэбы».

Вышэйпрыведзены факт з **Жалейкай** не адзінкавы. У калгасе імя «VI зьезду Саветаў» знайшоўся «свой» Жалейка. Старшыня праўленьня **Шабуня**, сьледуючы прынцыпам кулацкай дзяльбы, разьмеркаваў усю ільнатрасту паміж калгасьнікамі. Не забыў Шабуня і пра сябе. На яго долю прыпала столькі трасты, што прыйшлося наймаць людзей для дапамогі ў перапрацоўцы. У калгасе «Сіла», Усайскага сельсавету, паводле загаду праўленьня, больш за 2 цнт. трасты выкарыстана на подсьціл жывёле. Такіх фактаў безьліч.

Многія сельсаветы і парт'ячэйкі ня толькі не арганізоўваюць калгасьнікаў і аднаасобнікаў на барацьбу за выкананьне плянаў, але не націскаюць па кулацка-заможныя элемэнты і нярэдка патураюць ім. **За апошнія два месяцы па цьвёрдых заданьнях не паступіла ніводнага кілё валакна.**

Карыстаючыся аслабленьнем націску, кулацкія элемэнты спэкулююць валакном на прыватным рынку. Так, цьвёрдазаданьнік **Карабань** Ісак (в. Рагуцкая, Жарскага сельсавету) і **Кандрацкі** Ігнат (в. Латоўшчына, Чарапоўчыцкага сельсавету), ня выканаўшы заданьняў, распрадалі на рынку некалькі цэнтнэраў валакна.

Кіраўнікі Загатільну, работнікі райснабу і многіх сельсаветаў чамусьці не заўважаюць падобных фактаў. Асобныя кулацка-заможныя элемэнты за сабатаж заданьняў дзяржавы, нібы, і прыцягнуты да адказнасьці. Але таго варта гэта пакараньне, калі накладзеныя штрафы ў большасьці не спаганяюцца.

У апошнія часы ў колах раённых работнікаў «неафіцыяльна», але ўзмоцнена культывуецца думка аб нерэальнасьці плянаў, аб так званым недасеву. На гэтай аснове ўзаконьваюцца дэмабілізацыйныя настроі і санкцыянуецца згортваньне кампаніі.

Вопыт перадавікоў—калгасаў, сельсаветаў, а таксама вышэйпрыведзеныя факты зьяўляюцца яркім доказам абсалютнай неабгрунтаванасьці, нікчэмнасьці балбатні аб «недасеве», аб «прапажы».

Гэтыя апартуністычныя «аргументы» выцягваюцца для таго, каб апраўдаць нічым неапраўданую бязьдзейнасьць.

З тым становішчам, у якім знаходзяцца ільназагатоўкі па Вушацкім раёне, з тымі тэмпамі, якімі працуе ў гэтай галіне Загатлён, гарснаб, пераважная большасьць сельсаветаў і партыйных ячэек,—**нельга мірыцца ні на адну мінуту.**

Трэба да канца выкрыць апартуністычную сутнасьць тых «прычын» і «аргументаў», якія ляжаць у аснове дэмабілізацыі, і моцна ўдарыць па кулацкіх падпявалах, якія пралезьлі да кіраўніцтва паасобнымі калгасамі і ва ўгоду клясаваму ворагу вядуць да зрыву загатоўкі важнейшага віду сырцу.

Апрача гэтага райкому КП(б)Б належыла-б неадкладна заняцца праверкай мэханікі складаньня зводак. Аматары сваяасаблівых прэміраваньняў на процантах, «очковтиратели» павінны атрымаць па заслугах.

Карцель, Сурганаў.

Рэдакцыяй газэты „Зьвязда“ на 22 красавіка, у 7 гадзін вечара, склікаецца НАРАДА ПА ПЫТАНЬНІ АБ ЗАГАТОЎЦЫ, ХАВАНЬНІ І ПЕРААПРАЦОЎЦЫ ГАРОДНІНЫ СЭЗОНУ 1932 г.

Запрашаюцца кіраўнікі (або іх намесьнікі) наступных арганізацый: 1) Белплодагароднины, 2) Белкалплодагароднины, 3) Плодагароднагасцэнтру, 4) Наркамснабу, 5) Белсельгасаб'яднаньня, 6) Канторы Саюзтрансу, 7) Садагародтрэсту, 8) Плодаэкспарт, 9) усіх ЗРК гор. Менску, 10) сэктару снабжэньня ЦСПСБ і гарпрафсавету і 11) прадстаўнікі газэт «Рабочий», «Савецкая Беларусь», «Калгасьнік Беларусі», «Сельгасрабочы» і «Чырвоная зьмена».

Нарада адбудзецца ў памяшканьні рэдакцыі: Савецкая 63, 3-ці паверх, кабінэт рэдактара.

РЭДАКЦЫЯ «ЗЬВЯЗДЫ».

М. ГАРЫН

У БАРАЦЬБЕ З КЛЯСАВЫМІ ВОРАГАМІ І АПАРТУНІСТАМІ ПАБУДУЕМ БЯСКЛЯСАВАЕ ГРАМАДЗТВА

4. Партыя, барацьба з апартунізмам і ўхіламі ад ленінскай нацпалітыкі

Апартуністычныя тэорыі па пытаньні аб дзяржаве выклікаюць ліквідатарскі пункт гледжаньня і паконт нашай партыі. Ёсьць проста ліквідатарскія разважаньні на тэму, што раз зьнішчаюцца клясы, то на будзе патрэбна і партыя, то можна аслабіць барацьбу з апартунізмам. Гнілыя лібэралы думаюць, што ня трэба зараз узмацняць барацьбу з апартунізмам, а некаторыя лагаворваюцца да таго, што партыя зьлівецца з клясай, што зьмяніўся сацыяльны характар нашай партыі. Гэтыя людзі ў «сарамлівай» форме праводзяць паказваць справу так, што наша партыя ўжо, уласна кажучы, не зьяўляецца авангардам аднаго пралетарыяту. Такі пункт гледжаньня зусім няправільны. Тыя, хто ставіць так пытаньне, забываюць, што хаця ў нашу партыю ўцягваюцца апрача рабочых і пэўная частка служачых і перадавых калгасьнікаў, але, адна, неадменнай умовай уступленьня іх у рады нашай партыі зьяўляецца тое, што яны абавязаны стаць на пункт гледжаньня пралетарыяту. І хаця наша партыя мае ў сваім складзе ня толькі рабочых, яна зьяўлялася і зьяўляецца авангардам рабочае клясы. Наша партыя будзе існаваць і ў бясклясавым грамадзтве, будзе заставацца авангардам пралетарыяту гэтак-жа сама, як наша краіна і пасьля ліквідацыі клясаў будзе заставацца авангардам сусьветнай рабочай клясы. Нельга думаць, што адразу пасьля ліквідацыі клясаў усе яьявяцца на аднолькавым узроўні, аднолькава сьвядомымі, рашучымі, адважнымі, гатовымі весьці барацьбу за камунізм. Наша задача і ў будучыні—падымаць самыя шырокія масы на ўзровень рабочай клясы. Сьмешна было-б думаць, што ў нараўнаньні з пралетарыямі, якія працавалі на прадпрыемствах дзесяцігодзьдзямі, многія з якіх прайшлі праз жорстку капіталістычную эксплёатацыю, якія загартавалі сябе ў радах партыі, у барацьбе з апартунізмам, якія паказалі на працы ўзоры камуністычных адносін да працы, узровень і падрыхтаванасьць, сьвядомасьць, разумоньне камунізму новых рабочых, якія толькі прыйшлі з калгасу будуць аднолькавымі. І таму няправільнымі, ліквідатарскімі зьяўляюцца спробы паказаць справу такім чынам, што ў канцы другой пяцігодкі непатрэбна будзе партыя, адамрэ неабходнасьць у авангардзе.

Партыя будзе існаваць да таго часу, пакуль усе працоўныя не падымуцца на ступень арганізаванасьці і сьвядомасьці пралетарыяту. Партыя будзе існаваць да таго часу, пакуль пралетарыят у цэлым не падымецца да ўзроўню камуністычнай партыі. Пакуль існуе пралетарская дыктатура, да таго часу будзе існаваць сталёвы хрыбет дыктатуры — камуністычная партыя.

> «Партыя патрэбна пралетарыяту для таго, каб заваяваць і ўтрымаць дыктатуру. Партыя ёсьць прылада дыктатуры пралетарыяту.
>
> Але з гэтага вынікае, што са зьнікненьнем клясаў, з адміраньнем дыктатуры пралетарыяту павінна адмерці і партыя» («Пытаньні ленінізму», стар. 70).

У канцы другой пяцігодкі клясы будуць зьнішчаны, але дыктатура пралетарыяту яшчэ існуе. Значыцца, гаварыць аб адміраньні партыі адразу пасьля другой пяцігодкі таксама няправільна, як і аб адміраньні дыктатуры пралетарыяту.

Таксама няправільным, гнілым лібэралізмам зьяўляецца спроба паказаць справу такім чынам, што ў другой пяцігодцы мы можам аслабіць барацьбу з апартунізмам, што заўчасна гаварыць аб тым, якая розніцца ад апартунізму прадстаўляе галоўную небясьпеку. Чаму правы апартунізм прадстаўляе сабой галоўную небясьпеку? Тав. Сталін гаварыў:

> «Сіла правага апартунізму заключаецца ў сіле дробна-буржуазнай стыхіі, у сіле напору на партыю з боку капіталістычных элемэнтаў наогул, з боку кулацтва ў асабліваасьці. І іменна таму, што правы ўхіл адлюстроўвае супраціўленьне асноўных элемэнтаў аджываючых клясаў, іменна таму правы ўхіл ёсьць асноўная небясьпека нашага часу ў партыі».

Правы апартунізм будзе і надалей адлюстроўваць супраціўленьне капіталістычных элемэнтаў, кулацтва. І таму і ў бліжэйшыя гады правы апартунізм застаецца галоўнай небясьпекай. Нам трэба весьці рашучую барацьбу з правымі і «левымі» апартуністамі. Гэты вывад вынікае з усёй гісторыі нашай партыі. Мы здолелі перамагчы таму, што партыя пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту разграміла трацкізм і правы апартунізм, таму, што партыя штодзённа бязьлітасна змагаецца з правымі і «левымі» апартуністамі.

Трацкісты адмаўлялі магчымасьць пабудовы сацыялізму ў адной краіне. Трацкісты прабавалі стрымаць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, тэмпы індустрыялізацыі. Тав. Сталін яшчэ на XVI зьезьдзе ўказаў, што няправільна паступаюць таварышы, якія думаюць, што трацкісты ўвесь час былі звышіндустрыялізатарамі тады, як у сапраўднасьці яны былі пагаленькімі капітулянтамі. Што справа стаіць імен на так, відаць з цьверджаньня Троцкага, які ў 1930 г. пісаў: «Апазыцыя ніколі ня бралася ў кароткі тэрмін дагнаць і перагнаць капіталістычны сьвет».

Гэта вытрымка сьведчыць, што яны прабавалі стрымаць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне. Яны ня ставілі задачу дагнаць і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны, а змагаліся супроць партыі, якая паставіла гэту задачу і яе ажыцьцяўляе. І дзякуючы таму, што мы пасьлядоўна ажыцьцяўлялі палітыку партыі, мы ўжо ў канцы другой пяцігодкі па радзе галін дагонім капіталістычныя краіны ў тэхніка-эканамічных адносінах. Ужо ў другой пяцігодцы наша краіна ў тэхнічных адносінах будзе на першым месцы ў Эўропе.

У галіне сельскай гаспадаркі трацкісты заўсёды выступалі супроць суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як клясы. Калі яны яшчэ прыкрываліся «левымі» фразамі аб кулаку, яны абаранялі палітыку «царапаньня», як гаварыў т. Сталін, але ніколі не стаялі за ліквідацыю кулацтва як клясы. Трацкісты ня верылі ў сілы рабочай клясы, ня верылі, што рабочая класа павядзе за сабою сялянства на будаўніцтва сацыялізму. І зразумела, што калі-б партыя не разграміла трацкістаў, ня выкрыла-б гэтага нявер'я ў магчымасьць навесьці за сабою сялянства, то мы пабудаваць сацыялізм не змаглі-б. Ужо тады, калі шырокім фронтам разгарнулася суцэльная калектывізацыя, Троцкі пісаў. «Сацыялістычную перабудову сялянскіх гаспадарак мы мыслім ня інакш, як у перспэктыве дзесяцігодзьдзяў». Троцкі прабуе запэўніць, што ліквідаваць клясавыя супярэчнасьці ў вёсцы, як і супярэчнасьць паміж горадам і вёскай, можна толькі ў разультаце міжнароднай рэвалюцыі. «Ліквідаваць супярэчнасьці ў вёсцы можна толькі ліквідаваўшы пролетарыяцтва паміж горадам і вёскай, а гэта ажыцьцёўна толькі ў рамках міжнароднай рэвалюцыі».

Ужо пасьля таго, як дробнае сялянства стала на шлях суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як клясы, ужо пасьля таго, як самі сяляне, пад кіраўніцтвам рабочае клясы, сталі на шлях раскулачваньня, Троцкі патрабаваў: «Прыпыніць палітыку адміністрацыйнага раскулачваньня, абмежаваньне эксплёататарскіх тэндэнцый кулака застаецца ў сіле яшчэ на многа год». Замест палітыкі ліквідацыі кулацтва Троцкі прапановаў у 1930 г. выходзіць з таго, што «кіруючым пачаткам у адносінах да кулацкіх гаспадарак павінна быць жорсткая кантрактацыя». Вось якую палітыку трацкісты прабавалі навязаць партыі, вось што трацкісты замест будаўніцтва сацыялізму ў адной краіне прабавалі навязаць нашай партыі. Вось чаму важнейшай умовай перамогі зьяўляецца тая работа, якую правяла партыя па разграміленьні і выкрыцьці трацкізму — гэтага перадавога атраду міжнароднай контр-рэвалюцыі.

Адсюль мы павінны для сябе зрабіць вывад, наколькі важна зараз праводзіць далей справу выкрыцьця ўсякай спробы працягнуць кантрабандным шляхам контр-рэвалюцыйныя трацкісцкія ідэйкі. Наш абавязак выканаць тыя ўказаньні, якія даны т. Сталіным у яго лісьце ў часопіс «Пролетарская революция». Мы павінны выкрываць ва ўсіх галінах навукі ўсякае праяўленьне гнілога лібэралізму да меншавіцка-трацкісцкай і шляпнікаўскай кантрабанды. У прыватнасьці неабходна прадаўжаць работу па выкрыцьці трацкісцкай кантрабанды па гісторыі партыі, якая працягвалася групай Эльвова-Кіна ў гісторыі УсеКП(б) пад рэд. т. Яраслаўскага.

Наша партыя ня здолела-б перамагчы, калі-б яна не разграміла правых апартуністаў. На словах правыя апартуністы не адмаўлялі магчымасьці пабудовы сацыялізму ў нашай краіне. На справе-ж яны сталі на пункце гледжаньня мірнага ўрастаньня кулака ў сацыялізм, яны выступалі супроць саўгасаў і калгасаў, супроць ліквідацыі кулацтва, супроць пяцігодкі, супроць тэмпаў індустрыялізацыі. На справе яны сталі на пазыцыях рэстаўрацыі капіталізму ў нашай краіне, а гэта значыць, што на практыцы яны адмаўлялі магчымасьць пабудовы сацыялізму ў нашай краіне.

Партыя і ў другой пяцігодцы будзе весьці самую рашучую барацьбу з усякімі праяўленьнямі апартунізму, як з правым — галоўнай небясьпекай, так і з «левым». У чым зараз праяўляецца правы апартунізм? Правы апартунізм разьвівае далей «тэорыі» патуханьня клясавай барацьбы, мірнага ўрастаньня кулака ў сацыялізм. Правыя апартуністы на практыцы не змагаюцца з засьмечанасьцю калгасаў кулацкімі элемэнтамі. У нас, напрыклад, на Беларусі, цэлы рад калгасаў засьмечаны кулацкімі элемэнтамі, а правыя апартуністы па практыцы ня толькі не вядуць барацьбы з гэтым, а, наадварот, дапамагаюць кулаком, якія вядуць падрыўную работу ў калгасах. Правыя не вядуць барацьбы з кулацкімі рвацкімі тэндэнцыямі ў саўгасах і калгасах. Правыя апартуністы пакідаюць справу калектывізацыі на самацёк. Правыя апартуністы выступаюць супроць тэмпаў індустрыялізацыі. Яны супроць перабудовы ўсёй нашай работы ў духу выкананьня пасьці Указаньняў тав. Сталіна. Побач з гэтымі і іншымі старымі формамі праяўленьня правага апартунізму ўжо зараз можна бачыць новыя яго формы. Бясспрэчна, праяўленьнем правага апартунізму зьяўляецца недаацэнка, неразуменьне кіруючай ролі пралетарыяту ў рабоце па ліквідацыі капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул у нашай краіне. Яна адчуваецца ў неразуменьні таго, што не пралетарыят раствараецца ў агульнай масе працоўных, а, наадварот, пралетарыят перарабляе ў працэсе ліквідацыі клясаў самога сябе, узьнімае, змагаецца за тое, каб падняць на свой узровень працоўныя масы. Пралетарыят, змагаючыся за тое, каб працоўныя зашлі такое-ж становішча, як і рабочая класа ў працэсе вытворчасьці, адначасова змагаецца за тое, каб яны падняліся да яго і ў галіне сьвядомасьці.

Правыя не разумеюць, што наш сучасны пралетарыят, вядучы барацьбу і пасьля другой пяцігодкі за перамаганьне перажыткаў капіталізму ва ўласных радох, ажыцьцяўляючы дыктатуру пралетарыяту, будзе змагацца супроць рэшткаў кулацкіх і дробна-буржуазных перажыткаў.

Можна ўжо зараз пашчупаць пявер'е правых апартуністаў у магчымасьць рэалізацыі тэй гігіенічкай работы, якая намечана партыяй на тэхнічнай рэкан струкцыі краіны. Правы апартунізм, бясспрэчна, праяўляецца ў барацьбе супроць пастаноў XVII усесаюзнай канфэрэнцыі аб ліквідацыі капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул. Правыя апартуністы будуць і надалей прабаваць размагнесьваць партыю і пралетарскую дыктатуру. Са сказанага відаць, наколькі актуальна перад намі стаіць задача барацьбы з правым апартунізмам і з усякім праяўленьнем прымірэнцтва да яго.

Адначасова трэба змагацца і з «левым» апартунізмам, з «левымі» загібшчыкамі. Вопыт апошняга году паказаў, што ў цэлым радзе раёнаў, у прыватнасьці, у нас на Беларусі, мелі і зараз яшчэ бясспрэчна маюць месца «лявацкія» перагібы. «Левыя» загібы выяўляюцца ў пагоні за дутымі процантамі калектывізацыі, у прымусовым аграмажэньні кароў і дробнай жывёлы ў паасобных калгасьнікаў, у перасякваньні праз арцель, у нежаданьні на справе ажыцьцяўляць цэнтральную задачу калгаснага будаўніцтва—арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. «Левыя» загібшчыкі на прадпрыемствах абараняюць ураўнілаўку і абязьлічку. Побач з гэтымі і радам іншых старых форм праяўленьня «левага» ўхілу (просты прадуктаабмен, у галіне плянаваньня, перагібы ў загатоўках, у школьным будаўніцтве і г. д.) можна ўжо пазнаткаць і некаторыя новыя формы яго праяўленьня.

«Левакі» адмаўляюць лінію нашай партыі на ператварэньне селяніна праз калгас, праз арганізацыю МТС, мэханіз

Юр. ТАКАРЧУК

ПА ТОЙ БОК МЯЖЫ

КРЫЗІС КРОЧЫЦЬ...

„СЬЛЯДЫ СЬВЯТОЙ КРЫВІ...“

— Сьвятла, больш сьвятла,—прасіў Вольфганг Гётэ за некалькі мінут да сьмерці. Сучасная буржуазія ўнесла свае карэктывы да слоў вялікага паэта. Не сьвятла, а цемры, сярэднявяковай цемры патрабуе зараз перапалоханы буржуа ў паніцы перад крызісам. Буржуазная культура крута павярнула назад, у абдымкі містыцызму. Сусьветны эканамічны крызіс рэзка паскарае працэс яе распаду. Нават такі вагуўнічы апостал польскага фашызму, як «Кур'ер віленскі» з найглыбейшым пэсымізмам прадракае

«...блізкі і нямінучы ўпадак заходня-эўрапэйскай культуры».

У бясплённых спробах павярнуць назад кола сацыяльных патрасеньняў і адцягнуць масы ад рэвалюцыйнай барацьбы, буржуазія праз сваіх прафэсараў і журналістаў адраджае сярэднявяковыя казкі аб «цудах».

Н. так даўно, напрыклад, польская буржуазная прэса ва ўвесь голас крычала аб «абноўленых сьлядох сьвятой крыві Хрыста» (!). Пан бог, па словах буржуазных газэт, міласьліва не забывае пра сваю земную аўдыторыю. Пазбаўлены магчымасьці асабіста наведаць зямлю і выратаваць Эўропу ад крызісу, ён напамінае аб сабе... «сьлядамі сьвятой крыві». Буржуазная прэса з вар'яцкай радасьцю вітае «вялікі цуд». Ініцыятыву бярэ «ІКЦ». Гэта газэта з усіх сіл трубіць, што знайдена ў адным касьцёле

«...АЖЫЛІ СЬЛЯДЫ СЬВЯТОЙ КРЫВІ ХРЫСТА...»

Дзікая казка самым сур'ёзным відам санкцыянуецца, як «сьвятая праўда». Буржуазныя вучоныя і журналісты адзін за адным стараюцца даказаць сваю верасьць містыцызму і запэўняюць, што ўласнымі вачыма... бачылі гэтыя самыя «сьлады». Як заяўляе «ІКЦ».

«...цуд адбыўся пры вялікім натоўпе вучоных».

Як бачыце, нават «навука» падае ніц перад «цудоўнымі сьлядамі». Разам з буржуазнай прэсай яна лёкайскі схіляе калені перад выдумкай хітрых клерыкалаў, якія з шалёнай энэргіяй імкнуцца падтрымаць расхістаны прэстыж каталіцызму. «ІКЦ» не шкадуе слоў, каб як толькі можна больш пахлусіць аб «сьвятых сьлядох». Кампэтэнтнасьць газэты ў рэлігійных «цудах» выключна багатая. «ІКЦ» хлусіць і не чырванее. Бог, аказваецца, зусім не бюпіца частаваць грэшны натоўп «сьлядамі сваёй крыві». Славутыя «сьлядзі» з дапамогай клерыкалаў і буржуазнай прэсы «ажываюць уже наяўнішыню»:

«...абноўленыя сьлады сьвятой крыві,—захлынаецца «ІКЦ»,—існуюць акрэсьлены час. Бывае, капі пазрыяд цуду працягваецца да 50 дзён».

Няхай дрыжыць «агрэсыўная бальшэвія». Буржуазная прэса прадракае, што «сьлядзі сьвятой крыві Хрыста» і ў далейшым у гонар каталіцызму будуць... «ажываць». Ва ўсякім выпадку, так сказаць, устаноўлена, што анальгетычны «цуд»

«...паўторыцца праз 74 гады».

Няма сумненьня, што паважаныя рыцары «культуры і цывілізацыі» польскага фашызму не намераны чакаць столькі год паўтарэньня «вялікага цуду». Яны не сядзяць, склаўшы рукі, а... фабрыкуюць новыя казкі. Зараз польская буржуазная прэса смакуе чарговы «цуд», абвешчаны ў фашысцкай Польшчы. «Цудам» новага выданьня робіцца «сьвятая манашка», якая па словах «ІКЦ»... пяць год нічога ня есьць і ўсё-ж жыве (!). Так і напісана: пяць год нічога ня есьць, а жыве.

Міфічная манашка з пяцігадовым «галодным» стажам ператвараецца ў сваласаблівы кумір друку. Выхад эпойдзеи. Беспрацоўныя, не патрабуйце хлеба і работы, а веруйце і галадайце. Галадае-ж сьвятая манашка цэлых пяць год, пагаладайце і вы. Галоўнае—больш маліцеся і забудзьце аб хлебе і рабоце.

Газэтныя наслугачы буржуазіі абвяшчаюць ісьцінай самую ідыёцкую хлусьню, толькі-б яна адпавядала сацыяльным інтарэсам капіталізму. «Рэлігійныя цуды» ўваходзяць у арсэнал барацьбы буржуазіі супроць рэвалюцыйнага ўздыму мас.

«Кур'ер віленскі» прарочыць «блізкі і нямінучы ўпадак заходня-эўрапэйскай культуры». Фашысцкая газэта ня можа да канца назваць рэчы сваімі імёнамі. Гэты «нямінучы ўпадак» ужо даўным даўно пачаўся. Буржуазная культура на ўсіх парах імчыцца ў балота сярэднявяковай папоўшчыны.

БАРБАРЫ ДВАЦЦАТАГА СТАГОДЗЬДЗЯ

Адна за адной пакаціліся ў бяздонне сацыял-фашысцкія «тэорыі» аб «новай эры росквіту арганізаванага капіталізму». Крызіс няўмольна рушыцца наперад, усё больш падрываючы асноўныя пасторы капіталістычнай гаспадаркі. На дапамогу сацыял-фашысцкім лекарам капіталізму пакрышыў прыйсьці амэрыканскі буржуазны прафэсар Е. Конклін.

Шыпоўны прафэсар узяў па сабе місію «навукова апраўдаць»... голад мільённых мас, выкінутых на вуліцу капіталізмам. «Вучоны» муж жорстка абрушыўся на амэрыканскіх беспрацоўных за тое, што яны... ня хочуць паміраць галоднай сьмерцю. Прафэсар гнеўна махае кулакамі: як можна патрабаваць хлеба і работы, калі сама навука... вітае беспрацоўе:

«Прафэсар Е. КОНКЛІН, — піша н'ю-ёрскі «Таймс»,—заявіў, што беспрацоўе і цяжкі час не аслабляюць, а ўзмацняюць (!) чалавечы род. Некаторыя з больш слабых ЗГОДНА ЗАКОНУ ПРЫРОДЫ ВЫМРУЦЬ НА ТУРАЛЬНАЙ СЬМЕРЦЮ ПАД УДАРАМІ ЦЯЖКАГА ЧАСУ. Другія — ПАКІНУЦЬ РАЗМНАЖАЦЦА. Моцныя ўцалеюць і размножацца, узмацняючы такім чынам чалавечы род...»

«Таймс» раласна апладзе зьдзічэламу прадстаўніку «пэйтральнай навукі». Барбары дваццатага стагодзьдзя благаслаўляюць голад і беспрацоўе, народжаныя капіталізмам: слабыя, вымірайце,—моцныя — размнажайцеся. Беспрацоўныя, ня сьмейце патрабаваць хлеба і работы, а памірайце «натуральнай сьмерцю пад ударамі цяжкага часу, згодна закону прыроды...» Такава клясавая лёгіка буржуазіі.

Ахопленыя сьмяротным страхам перад гігантскім ростам крызісу і рэвалюцыйным уздымам мас, амэрыканскі буржуа абвяшчае голад... «законам прыроды». Буржуазная навука сьпяшаецца на дапамогу сваім капіталістычным патронам і «даказвае», што «беспрацоўе... узмацняе чалавечы род». Астаноўка толькі за тым, што «слабыя» (чытай: пралетары) ня згодны з «законам прыроды» і ня хочуць вымірацъ «пад ударамі цяжкага часу».

З «Таймсам» перакліканецца фашысцкі «Кур'ер віленскі». Ён—таксама за фізычнае зьнішчэньне беспрацоўных, бо

«...перапрадукцыя людзей асуджана на пагібель, або НА СТВАРЭНЬНЕ РЭВАЛЮЦЫІ Ў СВАІХ КРАІНАХ».

Вось дзе зарыты сабака. Зьвярыны страх перад рэвалюцыяй падганяе буржуазных прафэсараў майстраваць «тэорыю» за «тэорыяй» апраўданьня абанкрутаваўшай капіталістычнай сыстэмы.

Крывая беспрацоўе катастрафічна ўзьнімаецца ўверх. Голад становіцца пастаянным госьцем у сям'і амэрыканскага пралетара. У краіне «прасперці»

«...АМЭРЫКАНЦЫ ПАМІРАЮЦЬ СОТНЯМІ АД ГОЛАДУ,—сьцяўшы зубы прызнаецца нават старшыня так званай камісіі працы амэрыканскага Кангрэсу, кангрэсмэн КОНЭР».

І гэты жудасны факт абвяшчаецца... «умацаваньнем чалавечага роду». Цынізм, варты «Таймса». У н'ю-ёрскай буржуазнай прэсы ёсьць нават. калі хочаце, дакументальныя даныя аб... карысьці беспрацоўя. Падумайце толькі, «слабыя» гінуць, «моцныя»—размнажаюцца, ну, а ў «моцных», як вядома, бывае... шмат крыві. Н'ю-ёрскі друк наперабой паведамляе «радасную вестку»: у Амэрыцы з кожным днём падаюць цэны на чалавечую кроў, прапанова перавышае попыт. Адсюль робіцца выключны па сваім цынізьме вывад: «чалавечы род узмацняецца, у яго нават стала больш ліпкаў крыві».

«Таймс» і яго калегі, аднак, скромна маўчаць, што сваю кроў прадаюць не шчасьлівыя «моцныя», а галодныя беспрацоўныя. Спрэзы н'ю-ёрскіх кантор, якія гандлююць чалавечай крывёй, ідуць добра. Ля іх дзьвярэй заўсёды стаіць доўгая чарга беспрацоўных. Яны ня могуць нават за грошы прадаць свае рукі, застаецца прадаваць кроў для буржуа, хворых на малакроўе. За некалькі далляраў н'ю-ёрскі беспрацоўны дням! дабываецца «шчасьця» прадаць «ліпкі» сваёй крыві, каб адтэрмінаваць галодную сьмерць. Прафэсар Конклін і «Таймс» могуць радавацца: «...чалавечы род узмацняецца».

Ідэйкі «Таймса» з крыважэрным запалам канкрэтызуе яго эўрапэйскі брат па пяру і класе—газэта «ПРЫКАРПАЦКА РУСЬ». Яна не жадае чакаць, пакуль беспрацоўныя вымруць «натуральнай сьмерцю». У газэты ёсьць больш радыкальная прапанова —забойства (!) «Прыкарпацка Русь» адкрыта патрабуе «ў імя выратаваньня чалавецтва»

«...КРЫХУ ЗЬВЕРСТВА І ЗАБОЙСТВА».

Клясавы зьвер скінуў маску.

Дзікія дыфірамбы «Таймса» па адрасе «цяжкага часу», незалежна ад волі іх аўтара, гучаць, як прыгавар капіталізму. Амэрыканскі пралетарыят, наперакор «законам прыроды», на чале з кампартыяй узьнімаецца на барацьбу за рэвалюцыйны выхад з крызісу. Трашчыць па ўсіх швох «апошняя цьвярдыня давер'я» (так называе Амэрыку капіталістычная прэса). Усё часьцей буржуазія вуспамі сваіх сэнатараў, напрыклад, Вілера, патрабуе

«...АСЬЛІНАВАЦЬ СРОДКІ ДЛЯ ТАГО, КАБ ВЫРАТАВАЦЬ АМЭРЫКУ АД РЭВАЛЮЦЫІ».

Нічога ня выйдзе. Ні воўчая пропаведзь Конкліна, ні вяўнічыя прызывы Вілера ня спынаць магутнага ўздыму рэвалюцыйнай барацьбы амэрыканскага пралетарыяту.

ЛЁКАЙ ДРЫЖЫЦЬ, ЛЁКАЙ НЭРВУЕ...

У сацыял-фашысцкага «Роботніка» моцныя нервы. Яго нічым ня зьдзівіш. Ён нават... гандаль людзьмі лічыць зусім звычайнай справай. Выпрабаваны лёкай фашыцкай дыктатуры верай і праўдай служыць сваім гаспадаром. Няхай сабе галодныя «хлопы», даведзеныя польскім фашызмам да апошняй грані галечы, прадаюць з-за кавалка хлеба... сваіх дзяцей і жонак. У «Роботніка» ёсьць больш важныя «сацыялістычныя» справы, чым скажам, клопаты аб нейкіх «хлопах».

Трэба-ж, напрыклад, было пастарацца як магчыма лепш усадзіць нож у сьпіну забастоўкі польскіх гарнякоў. Уступаць пальму першынства ў сэнсе штрэйкбрэхэрства «Роботнік» не намеран. Аднак, і яму не ўдасьцца замаўчаць жудаснай вакханаліі голаду, які ахапіў сваімі жалезнымі шчупальцамі працоўнае сялянства Польшчы і акупаваных ЗБ і ЗУ:

«У часы, якія мы зараз перажываем, НАС НІШТО НЯ ЗЬДЗІЎЛЯЕ. Са Здунскай Волі (Лодзінскае ваяводзтва) паведамляюць аб наступным факце.

... НА РЫНАК ПРЫБЫЎ АДЗІН З МЯСЦОВЫХ СЯЛЯН НЕЙКІ ПЯТРЫКОЎСКІ, ЯКІ ПРЫВЕЎ З САБОЙ ДЛЯ ПРОДАЖУ ВАСЕМНАЦЦАЦІГАДОВАГА СЫНА. ПЯТРЫКОЎСКІ МЕЎ ДОМА ЯШЧЭ ТРОХ СЫНОЎ, АЛЕ НАДЗВЫЧАЙНАЯ ГАЛЕЧА НЕ ДАЗВАЛЯЛА ЯМУ ІХ ПРАКАРМІЦЬ І ЁН ПАРАШЫЎ ПРАДАЦЬ АДНАГО СЫНА ЗА 50 ЗЛОТЫХ. ЗНАЙШОЎСЯ І ПАКУПНІК З ВЕСКІ ЎРУБЛЁВА, ЯКІ ЗГАДЗІЎСЯ НА ЎМОВЫ БАЦЬКІ. ПАКУПНІК ТАКСАМА АБЯЦАЎ, КАЛІ ХЛАПЕЦ БУДЗЕ ДВА ГАДЫ ДОБРА СПРАЎЛЯЦЦА З РАБОТАЙ, ДАПЛАЦІЦЬ БАЦЬКУ ЯШЧЭ 20 ЦЭНТНЭРАЎ ЖЫТА, А ЗА ГЭТА ПРАДАНЫ СЫН ПЯРОЙДЗЕ ЦАЛКАМ У ЯГО ЎЛАСНАСЬЦЬ...» («Роботнік» № 111, 1932 г.)

«Роботнік», «не выдкіўляе» гэты начуваны гандаль. Даведзены да роспачы галодны «хлоп прывёў на продаж сына...» — што тут такое, глупства, самы звычайны факт. Сацыял-эдрацыйкі глашатай дыпляматычна ўпікае жамэнтараў...

Продаж дзяцей з-за кавалка хлеба —яркі дакумант капмарнага становішча сялянства ў фашысцкай Польшчы. Голад штурхае «хлопаў» на продаж «ліпкіх» дзяцей, каб пракарміць сям'ю. Адраджаецца свалсаблівае рабства. Жудасная паўпэрызацыя заходня-беларускай вёскі набывае ўсё большую глыбіню па меры абвастраньня сусьветнага эканамічнага крызісу. За дзецьмі ідуць на рынак жонкі...

«ІКЦ» весела дапаўняе «Роботніка» «пікантнай навіной»:

«З Львова паведамляюць: У ТУСТАНАВІЦАХ КАЛЯ БАРЫСЛАЎЯ АДБЫЎСЯ АРЫГІНАЛЬНЫ ВЫПАДАК — ПРОДАЖ ЖОНКІ ЗА ГРОШЫ.

Пражываючы там Ян Пыгічка, будучы ў цяжкім матар'яльным становішчы, прапанаваў заможнаму суседу — 60-гадоваму Сайдаку купіць жонку Ганну. На аснове пісьмовага дагавору, заключанага пры сьведках, Сайдак абавязаўся карміць Пыгічку пры месяцы і даў яму 50 злотых наяўнымі. ПАСЬЛЯ ЖОНКА ПЫГІЧКІ ПЕРАЙШЛА ВА ЎЛАСНАСЬЦЬ САЙДАКА». («Ілюстраваны кур'ер подзенны» № 22, 1932 г.).

Продаж жывога тавару для фашысцкай і сацыял-фашысцкай прэсы — «арыгінальны выпадак». Газэтныя агенты акупантаў з дзікай гіроніяй сьмяюцца над «хлопамі», якіх дыктатура польскага фашызму заганяе ў тупік галечы. Аднак, гэта сьмех скрозь сьлёзы. Карныя экспедыцыі і шыбеніцы ваенна-палявых судоў ня ў сілах супакоіць вёску. Польская прэса з жахам адзначае рост «антыграмадзкіх настрояў чорнага натоўпу». Працоўнае сялянства Польшчы і ЗБ ідзе за рабочай клясай на чале з КПП на барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры. Раскаты рэвалюцыйнай навальніцы кідаюць у паніку фашысцкіх і сацыял-фашысцкіх борзапісцаў.

ЦО сацыял-эдрацыйства сьпяшаецца папярэдзіць буржуазію аб грозным росьце рэвалюцыйнай барацьбы рабочых і сялянскіх мас. Яго не палохае адраджэньне рабства ў фашысцкай Польшчы. Яго «не зьдзіўляе» гандаль жывымі людзьмі. «Роботнік» кідае ў пот ад факту, якога ён сам ня можа замаўчаць. Са страхам і трывогай лёкай крычыць аб тым, што

«... КАМУНІЗМ УСЁ МАЦНЕЕ!»

Лёкай дрыжыць, лёкай нэрвуе...

ХАМЭЛЬЁНЫ З ПАРЫЖУ І ВАРШАВЫ

Ня думайце, што... белагвардзейцам падабаецца капіталізм. Памыляецеся. Яны... «асуджаюць» капіталістычную сыстэму. Больш таго... Белагвардзейшчына, калі хочаце, жадае быць... «пракурорам» супроць капіталу. Ня верыце? Дарэмна. Паслухайце, што прапаведуе сам «вялікі князь» Кірыл:

«... капіталізм вырадзіўся ў форму рабскага спужэньня народаў значнай меншасьці. Народы, аднак, пачынаюць адкрываць свае вочы і барацьба супроць прыгнятальнікаў расьце».

Эўрапэйскі буржуа «абуран»: што такое, нават «вялікі князь», «насьледнік расійскага прэстолу»... амаль галасуе за рэвалюцыю. Парыжкая проса б'е са штучным жахам у набат:

«... рускі вялікі князь асуджае капіталізм (!)».

«Паніка» буржуазіі, выкліканая «рэвалюцыйным» выступленьнем белагвардзейскага «манарха» без манархіі проста хітры манэўр. Хітрым манэўрам выступаецца і само выступленьне «вялікага князя». Асколькі «адзінай і непадзельнай» з падвойнай энэргіяй фабрыкуюць праваслаўцы за праваслаўцы. Разгул японскай фашчыны на Далёкім Усходзе акрыляе банду інтэрвэнтаў. Белагвардзейскія пацукі заварушыліся. З благаслаўленьня японскага імпэрыялізму яны з вар'яцкай упартасьцю імкнуцца распаліць новую антысавецкую вайну.

Ролі ў лягеры інтэрвэнтаў разьмеркаваны дасканала. У Манчжурыі белагвардзейцы па загаду з Токіё закладваюць дынаміт пад рэйкі КУЧ, а ў Парыжы іх так званы «вялікі князь»... «асуджае» капіталізм. Трэба-ж пусьціць пыл у вочы, каб замаскаваць крывавую работу белагвардзейскіх інтэрвэнтаў. Якая там падрыхтоўка да антысавецкай вайны, калі сам Кірыл... выступае супроць капіталізму.

Буржуазія ў пошуках выхаду з крызісу кідае ўсе сілы на барацьбу з рэвалюцыйным уздымам мас і шалёна рыхтуецца да нападу на СССР. Аднак, падпалышчыкам вайны небясьпечна выступаць з адкрытым забралам. У ход пускаюцца усе сродкі хлусьні, зману і інсынуацый. На сцэну выпаўзае сам «вялікі князь» з падзеяй пабыць танны капіталец на сваіх р-р-рэвалюцыйных фразах: паглядзеце, мы таксама «супроць капіталізму». Знаёмая заслона, за якой белагвардзейскія бандыты і іх гаспадары — імпэрыялісты майструюць інтэрвэнцыю супроць Савецкага Саюзу...

Орган польскіх прамысловых магнатаў — «Кур'ер варшавскі», як і грозны «абвінаваўца» капіталізму — «вялікі князь» Кірыл, апраўаецца ў «сацыялістычную» маску. «К. В.» са страхам бачыць, што эканамічны крызіс зусім не намеран сьпікаць. Капіталістычны рупар, так сказаць, да канца пераканаўся, што крызіс яшчэ доўга будзе «напаваць над чалавецтвам». А масы, ох, гэтыя масы, падумайце толькі, не жадаюць «крыху пагаладаць», пакуль наступяць «лепшыя часы».

У фашысцкай Польшчы нарастае рэвалюцыйны крызіс. «Непарушны бастыён» (гэтым тытулам надзяліў Польшчу фашысцкі друк) — у агні магутных клясавых баёў. «Кур'ер варшавскі» шукае выхад і «знаходзіць». Да ваенна-палявых судоў, як сродку «абароны культуры і цывілізацыі», да даецца... «Ліга клясаў»(!). Арганізуем «Лігу клясаў» для «зьнішчэньня рэвалюцыі», — заклікае «Кур'ер варшавскі», — у гэтым — «выратаваньне»:

«... РАЗ ЗЬЯВІЎСЯ ЛЕЗУНГ — «ПРЭЧ ВАЙНУ», ПАВІНЕН ТАКСАМА ЗЬЯВІЦЦА І ЛЕЗУНГ — «ПРЭЧ РЭВАЛЮЦЫЮ». РАЗ ІСНУЕ ЛІГА НАЦЫЯ, ПАВІННА ІСНАВАЦЬ ТАКСАМА І ЛІГА КЛЯСАЎ НА ПРЬНЦЫПЕ МІЖКЛЯСАВАГА АРБІТРАЖУ. ТРЭБА ЎСТАНАВІЦЬ ГАРМОНІЮ ПОГЛЯДАЎ, ПАЛЮБОЎНАЕ ВЫРАШЭНЬНЕ ГРАМАДЗКІХ ПЫТАНЬНЯЎ І ЗНІШЧЫЦЬ РЭВАЛЮЦЫЮ, ЯК МЭТАД БАРАЦЬБЫ».

Ну, чым не «сацыялізм» сацыял-фашысцкай маркі. За такую-ж праграму абецэдзьюма ружамі в радасьці галасуе і «Роботнік» — ЦО польскага сацыял-фашызму. Кур'ер варшавскі» бачыць, што цяжка і небясьпечна разгаварваць з масамі толькі па мове шыбеніц і карных экспедыцый. Газэта, як хамэльён, маскуецца і хітрує. Воўк робіць выгляд, што ён зусім ня воўк, а проста нявінная авечка; якой даражэй за ўсё «гармонія поглядаў і палюбоўнае вырашэньне грамадзкіх пытаньняў».

І так, няхай жыве «Ліга клясаў», каб буржуазіі было лягчэй «палюбоўна» распраўляцца з рэвалюцыйным рухам пралетарскіх мас. Няхай жыве «гармонія поглядаў», каб кожны, хто ня згодзен з думкамі буржуазіі, павіс на шыбеніцах ваенна-палявых судоў. Няхай жыве «палюбоўнае вырашэньне грамадзкіх пытаньняў» у імя «зьнішчэньня рэвалюцыі».

«Кур'ер варшавскі» настойвае, каб арганізатарам «Лігі клясаў» была Польшча, бо яна

«... ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА КРАІНАЙ З НАРМАЛЬНЫМІ (!?!) УЗАЕМААДНОСІНАМІ КЛЯСАВЫХ СІЛ. ПРЫ СЁНЕШНІМ СТАНОВІШЧЫ РЭЧАЙ САМАЯ ВЯЛІКАЯ ТРУДНАСЬЦЮ УСТАНАЎЛЕНЬНЯ ГРАМАДЗКАГА ПАРАДКУ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА СТАРЫЯ МЭТАДЫ КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЫ. МАГЧЫМА, ШТО Ў СВОЙ ЧАС ЯНЫ БЫЛІ НЕАБХОДНЫ, НАВАТ НЕЗАМЯНІМЫ ДЛЯ АРГАНІЗАЦЫІ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ, АЛЕ РАЗ ГЭТА ДАСЯГНУТА (!!!), ЯНЫ (МЭТАДЫ) БОЛЬШ НЕПАТРЭБНЫ...».

Воўк вышчарыў клыкі. Яму патрэбна ня «Ліга клясаў», а «Ліга» задушэньня клясавай барацьбы пралетарыяту. Дарэмныя надзеі. Апалёгетам «гармоніі поглядаў» не дапамогуць іх высокія праекты. Магутны вал пралетарскай рэвалюцыі змые проч і аўтараў «Лігі клясаў» і іх гаспадароў.

справу так, што «паміж калгасным сялянствам і рабочай клясай адбываецца клясавая барацьба». «Левыя» перакідваюць на пытаньні аб ліквідацыі процілегласьці паміж горадам і вёскай і г.д. З усяго сказанага відаць, як актуальна барацьба з «левымі» загібшчыкамі і прымірэнцамі да іх.

***

У эпоху дыктатуры пралетарыяту нацыянальныя культуры дасягаюць і дасягнуць вялізарнейшага разьвіцьця. Ужо ў першай пяцігодцы мы дасягнулі вялікіх рэзультатаў у ліквідацыі эканамічнай і культурнай адсталасьці цярпячых раней пры царызьме і буржуазна-часовым уладзе народаў. Тэмпы разьвіцьця прамысловасьці адсталых саюзных і аўтаномных рэспублік і абласьцей перавышаюць нават вялізарныя тэмпы разьвіцьця ўсяго Савецкага Саюзу. Кожны працоўны Беларусі гэта бачыць на вопыце нашай рэспублікі. Рост выпуску прамысловай прадукцыі па СССР за 1931 год роўны 21 проц., а ў БССР каля 70 проц. На 1932 год намечан рост па СССР 36 проц., а рост прамысловасьці БССР — 55 проц. Усім вядома, што ў Беларусі да Кастрычніцкай рэвалюцыі панавала дробная напоўсматужная прамысловасьць, а зараз мы маем дзесяткі буйнейшых прадпрыемстваў-гігантаў.

Якое значнае разьвіцьцё атрымала наша сельская гаспадарка, тэхнічныя культуры і жывёлагадоўля на аснове будаўніцтва саўгасаў, МТС, на аснове ажыцьцяўленьня суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як клясы, — ведае кожны рабочы, ведае кожны калгаснік. У гэтым годзе, праз некалькі тыдняў мы заканчваем ліквідацыю непісьменнасьці. А да рэвалюцыі 70 проц. усяго насельніцтва краіны было непісьменным. Да рэвалюцыі ў нашай краіне ня было ні адной вышэйшай навучальнай установы. А зараз у нас каля трох дзесяткаў ВНУ і каля 70 тэхнікумаў. Створаны тэатры, наладжана кіно-вытворчасьць, пабудаваны магутныя радыё-станцыі. Вялізарны размах атрымала беларуская літаратура. Выдаюцца на беларускай мове дзесяткі газэт і часопісяў. Няма такой галіны культуры і быту (камунальная гаспадарка, жыльлёвае будаўніцтва і г. д.), якая-б не атрымала за час рэвалюцыі і асабліва на працягу першай пяцігодкі вялізарнага разьвіцьця. Вельмі значнае разьвіцьцё атрымала і культура нацыянальных меншасьцей (яўрэйская, польская, літоўская і г. д.).

Другая пяцігодка ў напрамку ліквідацыі эканамічнай і культурнай адсталасьці ставіць перад намі яшчэ больш вялікія задачы. У пастанове XVII партканферэнцыі па дакладу т. т. Молатава і Куйбышава сказана:

«Шпаркі рост сацыялістычнай гаспадаркі ў перыяд другой пяцігодкі ў нацыянальных рэспубліках і абласьцях абумоўлівае зжываньне эканамічнай і культурнай адсталасьці нацыянальнасьцей, якая засталася ў спадчыну ад царскага калёніяльна-капіталістычнага рэжыму».

Канкрэтна аб дырэктывах разьвіцьця народнай гаспадаркі Беларусі ў другой пяцігодцы т. Куйбышаў у сваім дакладзе гаварыў:

«У другую пяцігодку разьвіцьцё гаспадаркі Беларусі будзе заснаўвацца на базе скарыстаньня рэсурсаў торфу, лесу і інтэнсыўнага разьвіцьця сельскай гаспадаркі. Асноўны напрамак сельскай гаспадаркі Беларусі — гэта прадукцыйная жывёлагадоўля, птушніцтва, тэхнічныя культуры, у прыватнасьці, лён і бульба. Буйны рост гэтай сырцовай базы для лёгкай індустрыі дае магчымасьць завяскетаваць значнае разьвіцьцё як харчовай, так і апрацоўчай прамысловасьці ў галіне ільну. Расьце торфаздабыча; таварышамі з Беларусі праектуецца торфа-хімічны завод. Гэта пытаньне павінна быць таксама дадатковай абмеркавана. Разьвіваецца выраб электраэнэргіі на торфе. З пасабовых прадпрыемстваў прамысловага будаўніцтва трэба адзначыць будаўніцтва ў галіне торфа-хэміі, у галіне папяровай сшэвы, у галіне дрэваапрацоўкі, леса-хімічная вытворчасьць, першалачатковая пераапрацоўка ільну і далейшая пераапрацоўка ільну (прадзіва, ткацтва)».

Такім чынам грандыёзнае разьвіцьцё атрымае народная гаспадарка і культура на Беларусі ў другой пяцігодцы. Такое-ж разьвіцьцё атрымаюць і іншыя рэспублікі і вобласьці Савецкага Саюзу. Адсюль відаць, як пасьлядоўна наша партыя ажыцьцяўляе ленінскую нацыянальную палітыку. КП(б)Б, як і ўся партыя, ажыцьцяўляе ленінскую нацыянальную палітыку, вядучы бязьлітаснае змаганьне на два фронты — супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму—галоўнай небясьпекі па даным этапе, супроць ухілаў у бок беларускага, яўрэйскага, польскага нацыяналізмаў.

Пабудова бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва ў канцы другой пяцігодкі ці ў якім выпадку, зразумела, ня зьмяняе з нас задачы далейшага разгортваньня нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Наадварот, нацыянальная па форме і сацыялістычная па зьмесьце культура атрымлівае свой найбольшы росквіт. Мы, камуністы, ведаем, што пасьля перамогі сацыялізму ва ўсім сьвеце будзе створана адзіная сацыялістычная культура і па форме і па зьмесьце, адзіная мова. Але адзіная па форме і па зьмесьце сацыялістычная культура, адзіная мова магчымы толькі пасьля перамогі дыктатуры пралетарыяту ва ўсім сьвеце, магчымы толькі пасьля таго, як нацыянальныя па форме культуры рэалізуюць усе свае магчымасьці, толькі пасьля пабудовы сацыялізму ва ўсім сьвеце. З гэтага повяду тав. Сталін на XVI зьезьдзе гаварыў:

«Можа паказацца дзіўным, што мы, Прыхільнікі зьліцьця ў будучым нацыянальных культур у адну агульную (і па форме і па зьмесьце) культуру, з адной агульнай мовай, зьяўляемся разам з тым прыхільнікамі росквіту нацыянальных культур у даны момант, у перыяд дыктатуры пралетарыяту. Але ў гэтым няма нічога дзіўнага. Трэба даць нацыянальным культурам разьвіцца і разгарнуцца, выявіўшы ўсе свае магчымасьці, каб стварыць умовы для зьліцьця іх у адну агульную культуру з адной агульнай мовай. Росквіт нацыянальных па форме і сацыялістычных па зьмесьце культур ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту ў адной краіне для зьліцьця іх у адну сацыялістычную (і па форме і па зьмесьце) культуру, з адной агульнай мовай, калі пралетарыят перамога ва ўсім сьвеце і сацыялізм увойдзе ў быт, — у гэтым іменна і заключаецца дыялектычнасьць ленінскай пастаноўкі пытаньня аб нацыянальнай культуры».

Таму пакуль сацыялізм будзе пабудован у адной краіне, ня можа быць гутарак аб зьліцьці, ня можа быць гутарак аб ліквідацыі культур нацыянальных па форме, сацыялістычных па зьмесьце. А, наадварот, да перамогі і па многа пасьля перамогі сусьветнай рэвалюцыі, мы абавязаны ўсямерна разьвіваць нацыянальную па форме і сацыялістычную па зьмесьце культуру. І толькі пасьля гэтага паўстане пытаньне аб ліквідацыі нацыянальных асаблівасьцей, аб зьліцьці ўсіх нацыянальных культур, аб стварэньні адзінай мовы. У адной-жа краіне гэта пытаньне ніяк ня можа быць вырашана. Усякія гуткарі аб зьліцьці ў адной краіне могуць быць на руку толькі аджываючым клясам раней панаваўшай нацыі.

Так стаіць пытаньне з нацыянальнымі культурамі. Пабудова сацыялістычнага грамадзтва ня толькі не адмаўляе далейшага разьвіцьця сацыялістычных культур, а, наадварот, мяркуе вялізарнае іх разьвіцьцё. Гігантскае разьвіцьцё атрымліваюць усе раней адсталыя народы, яны, пад кіраўніцтвам партыі, пры дапамозе пралетарыяту ўсяго Савецкага Саюзу, будуюць сацыялістычнае грамадзтва, у раней адсталых краінах будуюцца цяжкая індустрыя, лёгкая прамысловасьць, там разьвіваецца харчовая прамысловасьць, уздымаецца дабрабыт самых шырокіх рабочых мас, калгасьнікаў і бяднякоў, сераднякоў—адназасобнікаў, узьнімаецца на вялізарную вышыню будаўніцтва культуры, нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьмесьце.

Абвастраньне клясавай барацьбы, якое мы зараз назіраем у сувязі з разгорнутым сацыялістычным наступленьнем па ўсім фронце, абгрунтоўваецца і на вучастку нацыянальна-культурнага будаўніцтва. І ў другой пяцігодцы, у сувязі з канчатковай ліквідацыяй капіталістычных элемэнтаў і ліквідацыяй клясаў наогул у нашай краіне нам прыдзецца і на гэтым вучастку будаўніцтва перамагаць шалёнае супраціўленьне вялікадзяржаўных шавіністаў, беларускіх, яўрэйскіх, польскіх і іншых нацыяналістаў. Нам прыдзецца ня толькі падаўляць контр-рэвалюцыйныя, чорнасоценныя, вялікарасійскія, нацыянал-дэмакратычныя, антысэміцкія, сіяністска-бундаўскія і інш. групоўкі і вылазкі, але і ўнутры партыі нам прыдзецца весьці бязьлітасную барацьбу з агентурай клясавага ворага, з ухілам ад ленінскай нацыянальнай палітыкі. Ухілісты ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму зьяўляюцца агентамі ў партыі аджываючых клясаў панаваўшай раней вялікарасійскай нацыі. Яны адлюстроўваюць імкненьне эксплёататарскіх клясаў панаваўшай раней вялікарасійскай нацыі вярнуць сабе страчаныя ў рэзультаце Кастрычніцкай рэвалюцыі прывілеі. Вось чаму ўхіл у бок вялікарасійскага шавінізму зьяўляецца галоўнай небясьпекай. І ў нас, у КП(б)Б, мы можам за апошнія гады адзначыць бясспрэчную адхілізацыю вялікадзяржаўных шавіністаў. У сваіх «тэарытычных» разважаньнях і ў сваёй практыцы яны выходзяць з таго, што ў эпоху будаўніцтва сацыялізму нацыянальныя па форме і пралетарскія па зьмесьце культуры народаў СССР павінны перапрацоўваць развал, павінны ліквідавацца, асыміляваца з расійскай культурай.

Мы ўжо бачылі з прыведзеных вытрымкаў з работ т. т. Леніна і Сталіна, што нацыянальныя і дзяржаўныя розьнасьці існуюць і многа пасьля перамогі дыктатуры пралетарыяту ў сусьветным маштабе. Вялікарасійскія ўхілісты прабуюць часта прыкрыць свае вялікадзяржаўніцкія ідэйкі «інтэрнацыяналізкімі» гутаркамі. Як-жа, яны, вялікадзяржаўныя ўхілісты, стаяць са неадкладнае зьліцьцё нацый, культур, моваў. Зьліцьцё гэта павінна адбывацца, паводле іх думкі, на аснове барацьбы дзьвюх культур — расійскай і беларускай, расійскай і украінскай і г. д. Яны выходзяць прыкладна з наступнага тэзісу: «Моцная культура павінна перамагчы слабую». Моцнай культурай зьяўляецца, зразумела, з іх пункту гледжаньня, культура панаваўшай раней нацыі — расійская.

Ужо сама тэрміналёгія, ужо сама назва гэтай, з дазволу сказаць, «тэорыі» змаганьня дзьвёх культур ускрывае яе калёніязтарскі, вялікадзяржаўны характар. Ні аб якай барацьбе і перамогах аднэй нацыянальнай па форме, пралетарскай па зьмесьце культуры, над другой ня можа быць і гутаркі. У наш

90-тысячная японская армія сканцэнтравана ў Шанхаі

Войскі рыхтуюцца да аднаўленьня ваенных дзеяньняў

НАНКІН, 19. Афіцыяльнае агенцтва нанкінскага ўраду «Цэнтрал Ньюс Эджэнсі» паведамляе аб колькасьці японскіх войск у Шанхайскім раёне. Паводле слоў агенцтва, на першай лініі японскіх пазыцый у **раёне Люхэ-Цзяндзін знаходзіцца 50 тыс. японскіх войск.** На другой лініі **Цзяндзін-Нансян — 10 тыс.** японскіх войск. На трэцій лініі **Чапей — 30 тыс. японскіх войск.** Агенцтва падае, што ў сучасны момант **японскія войскі рыхтуюцца да аднаўленьня ваенных дзеяньняў. (ТАСС).**

Пэрспэктывы ўрэгуляваньня шанхайскага пытаньня далёка ня бліскучыя

ШАНХАЙ, 19. Прадстаўнік міністэрства замежных спраў паведаміў Майльс Лэмпсона, Сігеміцу і Джэнсона, што Го Тай-ці вернецца з Нанкіна ў бліжэйшым будучым і адновіць перагаворы з прадстаўнікамі Японіі, Майльс-Лэмпсон патрабаваў, каб аб гэтым былі паведамлены францускі пасланьнік і італьянскі навераны ў справах.

Перад ад'ездам з Нанкіна, Го Тай-ці паводле паведамленьня агенцтва «Рэйтэр, выказаў думку, што **пэрспэктывы ўрэгуляваньня шанхайскага пытаньня далёка ня бліскучыя.** Кітайскія колы лічаць, што **пасяджэньне «камітэту 19-ці» не зьмяніла становішча і магчыма нават пагоршыла яго,** бо цяпер Японія агаварыла за сабой права выкінуць, калі ўмовы стануць нармальнымі, каб эвакуяваць свае войскі. Мяркуюць, што канфэрэнцыя адкрыецца 21 красавіка.

200 млн. іен дадаткова на вядзеньне вайны

ТОКІЁ, 19. Урад пастанавіў склікаць чэрэзвычайную сесію парляманту на 25 мая, тэрмінам на два тыдні. Сесія абмеркуе рэгулеваньне бюджэт і пытаньне аб дадатковых асыгнаваньнях у 200 млн. іен на выдаткі на ўтрыманьні войск у Манчжурыі і Шанхаі.

Выбух парахавых складаў у Токіё

ТОКІЁ, 19. Паводле вестак выбухам зьнічтожыла буйны парахавы корпус японскага ведамства ў Такінаве (прыгэрад Токіё). Згодна папярэдніх вестак разбураны тры парахавыя патрабы. Выбухам разбурана 250 дамоў. Засталіся бяз прытулку 1.500 чалавек.

Уезд Велінгтону-Ку і кітайскім журналістам у Манчжурыю забаронен

ТОКІЁ, 19. Усе газэты паведамляюць, што міністэрства замежных спраў манчжурскага ўраду тэлеграфна паведаміла Іосізаву аб тым, што манчжурскі ўрад па-ранейшаму катэгарычна пярэчыць супроць прыезду Велінгтону-Ку і просіць японскі ўрад не дапусьціць прабываньня Велінгтона-Ку нават у межах чыгуначнай зоны. Манчжурскі ўрад пацвердзівае, што калі Велінгтон-Ку пакіне чыгуначную зону, дык ён будзе арыштаваны. Далей у тэлеграме міністэрства замежных спраў гаворыцца: «Зразумела, японскія войскі знаходзяцца на тэрыторыі нашай краіны згодна просьбы манчжурскага ўраду для падтрыманьня міру і парадку ў далёкіх раёнах. Дапушчэньне-ж Велінгтона-Ку супярэчыла-б гэтай асноўнай мэце прабываньня японскіх войск у Манчжурыі. Таму манчжурскі ўрад спадзяецца, што японскі ўрад ня будзе стаяць за дапушчэньне Велінгтона-Ку».

Мукдэнскія карэспандэнты газэт паведамляюць, што **манчжурскі ўрад забараніў таксама ўезд кітайскім журналістам,** якія суправаджаюць камісію Лігі нацый. Гэта забарона матывуецца тым, **што прысутнасьць журналістаў, таксама як і Велінгтона-Ку «парушыць мір і парадак у Манчжурыі».** (ТАСС).

Мільёны—на ўтрыманьне ўрангелеўскіх ваенных школ

ВЕНА, 19. Орган Югаслаўскай кампартыі **«Пролетэр»** паведамляе, што **ўрангелеўскія ваенныя школы ў Югаславіі існуюць на мільённыя субсыдыі,** якія адпускаюцца з так званых **сакрэтных урадавых фондаў.** Значная частка кучыны югаслаўскай ваеннай акадэміі **складзецца з урангелеўцаў.** Згодна вестак, якія ёсьць, **пяць урангелеўскіх афіцэраў пасланы ў Манчжурыю.** «Пролетэр» далей падкрэсьлівае, што ўрангелеўцы і былыя царскія ахраньнікі займаюць кіруючыя пасады ва ўсіх міністэрствах, у асабліваасьці ў міністэрстве ўнутраных спраў і ў паліцэйскім апараце. Яны знаходзяцца таксама на пасадах наглядальнікаў на чыгунках і ў дзяржаўных прадпрыемствах. Газэта заклікае да барацьбы з інтэрвэнцыяй, якая падрыхтоўваецца супроць Савецкага Саюзу і патрабуе выгнаньня белагвардзейцаў з Югаславіі. (ТАСС).

Зьверствы сігуранцы ў Бэсарабіі

Арыштоўваюцца цэлыя сем'і з жонкамі і груднымі дзецьмі

ВЕНА, 19. Пават буржуазна-нацыяналістычная румынская газэта «Лупта» з абурэньнем паведамляе аб зьверствах сігуранцы ў Бэсарабіі.

Газэта піша: «Жандармерыя абшукала ўсе дамы ў Кашшанах, арыштавала ўсіх вучняў кашшанскага ліцэя, а таксама каля 150 сялян.

Арыштаваныя закаваны ў ручныя і ножныя кайданы і на працягу ўжо 10 дзён катуюцца. На вуліцах—знікі і крыкі катаваных ахвяр. З іх многія ў цяжкім стане перавезены ў шпіталь. Арышты пашырыліся на ўсе вёскі ў ваколіцах Кашшан і Бэндэр. **Арыштавана каля 300 чал. Сярод іх ёсьць цэлыя сем'і з жонкамі, груднымі дзецьмі і г. д.** Калі не пакладуць канец старанасьці сігуранцы, **дык арышты дасягнуць хутка фантастычных разьмераў.** Насельніцтва паслала дэлегацыі ў міністэрства па бэсарабскіх справах у Бухарэсьце і да румынскага караля для пратэсту супроць злоўжываньняў уладай».

Ілюстрацыя да „маральнага" разбраеньня Польшчы

ВАРШАВА, 19. Польскія газэты вельмі стрымана паведамляюць аб прабываньні маршала Пілсудзкага ў Румыніі. Прамінчучыя толькі паведамленьне, што маршал прыняў удзел у сьвяце, арганізаваным 16 красавіка румынскім нязхотным палком, ганаровым шэфам якога зьяўляецца Пілсудзкі. Некаторыя газэты перадалі таксама, што маршал, «жадаючы паведаць шмат лікую польскую калёнію ў Бэсарабіі», **наведаў Кішынёў.** Газэта «Кур'ер Паранны» паведамляе, што маршал абгаварвае з румынскімі дзеячамі **праблему блёку дзяржаў Бальтыцкага і Міжземнага мора.** Газэта падкрэсьлівае, **што японская пагроза супроць СССР на Далёкім Усходзе аблягчае зараз задачу стварэньня польска-прыбальтыцкага блёку.**

Усеагульная забастоўка с.-г. рабочых у Польшчы

Бастуе звыш 25 тысяч батракоў

ВАРШАВА, 18. Пасьля двухразовага зьніжэньня зарплаты сельска-гаспадарчым рабочым на працягу апошніх двух год прадпрыемцы абвясьцілі зараз аб новым скарачэньні ставак, пачынаючы з вясны бягучага году **на 30-40 проц.**

Становішча яшчэ больш абвастрылася ў сувязі з масавым звальненьнем памешчыкамі сельска-гаспадарчых рабочых і замены іх падзёншчыкамі і радам мер, якія пагоршваюць становішча батракоў. Выходзячы з гэтага **прафсаюзная левая абвясьціла ўсеагульную забастоўку сельска-гаспадарчых рабочых** у знак пратэсту супроць зьніжэньня зарплаты і масавых звальненьняў. З прычыны таго, што **лёзунг забастоўкі быў з энтузіязмам прыняты батрацкай масай,** пэпэсэўскія лідэры спалохаліся. З мэтаю вырваць ініцыятыву з рук прафсаюзнай левай і сарваць забастоўку, сацыял-фашысты параўнялі абвясьціць дэманстрацыйную аднадзённую стачку на 18 красавіка. Гэты пэпэсэўскі манэўр праводзіцца звычайным чынам. Побач з гучнымі адозвамі і лёзунгамі **цішком вядзецца праца па зрыве забастоўкі на мясцох.** Орган верхня-сілескіх хрысьціянскіх дэмакратаў «Палёнія» зьмяшчае 16 красавіка паведамленьне пэпэсэўскага прафсаюзу аб тым, што забастоўка адмяняецца «з прычыны ўступак памешчыкаў».

Адкрылася канфэрэнцыя ударнікаў якасьці харчовай прамысловасьці

Учора, у 7 гадз. увеч., у клюбе харчавікоў адкрылася ўсебеларуская канфэрэнцыя ударнікаў якасьці харчовай прамысловасьці. Канфэрэнцыю адкрыў нам. Наркамснаба тав. ВАСКАБОЙНІКАЎ.

На канфэрэнцыю прыбыла 114 дэлегатаў. Прадстаўлены ўсе асноўныя прадпрыемствы харчовай прамысловасьці.

У прэзыдыум выбраны члены бюро ЦК КП(б)Б, а таксама 25 асоб, сярод іх т. т. Балцін, Камэнштэйн, Васкабойнікаў, Гарын, прадстаўнікі аб'яднаньняў НКС, ударнікі лепшых гаспадарча-разрахункавых брыгад, ударнікі ІТР, прадстаўнікі работнікаў прылаўку.

З дакладам аб становішчы і пэрспэктывах разьвіцьця харчовай прамысловасьці выступіў тав. ВАСКАБОЙНІКАЎ.

Адвольная зьмена колеру воўны жывой жывёлы

Вынаходзтва савецкага вучонага

Прафэсарам Ільліным вынайдзен спосаб адвольнай зьмены колеру воўны пляхам хэмізацыі жывой жывёлы. Вопыты былі праведзены ў саўгасе «Мопай» (Крым) на топкарунных аўцах і даказалі магчымасьць зьмены стрыжкі штучным ліквідыцем. Пад уплывам хэмізацыі праз пэўны час воўна адстае ад скуры жывёлы і можа быць зьнята цалкам. Гэта вынаходзтва падмяняе ручную, або мэханічную стрыжку авец і можа даць крайне ў год дзесятак мільёнаў рублёў эканомі.

Апрача таго ў выніку хэмізацыі магчыма зьмінаць воўну з жывёлы часткамі і такім чынам атрымаць пагатункавую воўну. З прубаваўнных авец, якія складаюць 95 проц. агульнага стада, пляхам узьмываньня мэтаду праф. Ільліна магчыма атрымаць мяккую воўну, прыгодную для топка-суконнай вытворчасьці.

Гэта павысіць удзельную вагу топкай воўны ў агульным сырцовым балансе воўнапрадпрацоўваючых фабрык з 5,8 проц. да 30,7 проц.

У бягучым годзе мяркуецца правесьці вопыты праф. Ільліна на 20 тыс. штук жывёлы.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Другая магнітагорская коксавая батарэя выдала першы кокс

МАГНІТАГОРСК. 18 КРАСАВІКА. Ў 9 ГАДЗІН РАНІЦЫ ДРУГАЯ КОКСАВАЯ БАТАРЭЯ ВЫДАЛА ПЕРШЫ КОКС. ТАКІМ ЧЫНАМ, З 18 КРАСАВІКА ЎЖО ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ ДЗЬВЕ НАЙВЯЛІКШЫЯ Ў СЬВЕЦЕ МАГНІТАГОРСКІЯ КОКСАВЫЯ БАТАРЭІ Ў СКЛАДЗЕ **138 ПЕЧАЎ.**

Макеёўская домна разгортвае выплаўку

МАКЕЁЎКА. Домна № 6 на Макеёўскім заводзе з кожным днём разгортвае выплаўку чыгуну. 16 красавіка домна дала 220 тон ліцейнага чыгуну, 17 красавіка — 400 тон і 18 красавіка—480 тон. У сувязі з пускавым пэрыядам на красавік для домны вызначана сутачнае заданьне ў 365 тон.

Выкананьне прамфінпляну прамысловасьці трэсту „БЕЛДРЭУ" за першую дэкаду красавіка

Паводле вестак трэсту «БЕЛДРЭЎ» прамысловасьць трэсту выканала за 10 дзён красавіка месячную вытворчую праграму на 34,2 проц. Выпушчана прадукцыі на суму 1.406.135 руб., у тым ліку праграма па **лесапіленьні** выканана на 28,5 проц., па **стандартных дамох**—62,2 проц., па **паркеце**—36,5 проц., па **сталярнай мэблі**—32,3 проц., па **будматар'ялах**—27,4 проц., па **стружкі**—31,2 %.

Паасобныя заводы далі наступнае выкананьне пляну: Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат—42,4 проц., завод імя Фрунзэ—31,2 проц., імя Валадарскага—24,8 проц., «Спартак»—29,8 проц., імя Халтурына—43 проц., Віцебскі лесазавод—19,5 проц., «Калектыўная праца»—36,1 проц., «Сацыялізм»—55 проц., імя Томскага—26,4 проц., «Чырвоны адраджэнец»—29,5 проц., «Камінтэрн—32,5 проц., імя Молатава—29,2 проц., «Пралетары»—22,6 проц., Полацкі лесазавод—10 проц.

Будматар'ялы

Дрэваапрацоўчы камбінат **«Камінтэрн»** за 15 красавіка расьпілаваў 194,7 кбм. сырцу, што складае 89,7 проц. пляну. Фанэры выпушчана 52 кбм., што складае 105,4 проц.

***

Рагачоўскі лесазавод імя Халтурына за 14 красавіка расьпілаваў 203,6 кбм. сырцу, што складае 107,7 проц. пляну.

Новы ёдавы завод

АШХАБАТ. На востраве Чэлекен пушчан у эксплёатацыю ёдавы завод. Першапачатковая прадукцыйнасьць заводу — 10 кгр. ёду-крышталю ў суткі з далейшым павялічэньнем выпуску да 25 кгр. у суткі.

603 тоны кузьнецкага чыгуну

КУЗЬНЕЦКАБУД. 18 красавіка Кузьнецкая домна выплавіла 603 тоны чыгуну. Былі чатыры плаўкі.

На Кузьнецкбудзе

КУЗНЕЦКБУД. 16 красавіка першая домна выплавіла 642,2 тоны ліцейнаму чыгуну. Домна напярэдадні праектнай выплаўкі.

***

КУЗЬНЕЦКБУД. 16 красавіка, у 18 гадз. і 40 мін. печы другой батареі кузьнецкага коксахэмкамбінату далі першы мэталургічны кокс высокай якасьці.

Папера

Паняровая фабрыка **«Герой працы»** за 15 красавіка выпусьціла 12 тон паперы, або 15 проц. пляну. Саломы-цэлюлёзы выпушчана 8 тон, або 66,7 проц. пляну.

***

Паняровая фабрыка «Чырвоная зорка» за 15 красавіка выпусьціла 14,4 тоны паперы, або 82,6 проц. Працавала толькі адна машына, а дзьве стаялі з-за недахвату апалу.

Абутак

Гомельская абутковая фабрыка аз 15 красавіка выпусьціла 992 пар ботаў, што складае 97,2 проц.; мужчынскіх бацінак — 1.100 пар, або 106,8 проц. і г. д. Усяго выпушчана 2.913 пар абутку, што складае 92,4 проц. заданьня. 16 красавіка выпушчана 1.044 пар ботаў, або 102,3 проц., мужчынскіх бацінак выпушчана 726 пар, або 70,5 проц. і г. д. Усяго выпушчана 3.031 пара, або 96,2 проц. пляну.

Дакладная мэханіка

Віцебская акулярная фабрыка за трэцюю пяцідзённку красавіка выпусьціла прадукцыі на суму 91.038 руб., што складае 103,7 проц. вытворчай праграмы, у тым ліку акуляраў выпушчана на суму 45.147 руб., што дае 106,2 проц. пляну; апраў выпушчана на суму 19.632 руб.—108,4 проц. пляну.

Птушкаводны камбінат

11 красавіка ў Полацку пачаў працаваць інкубатар-птушкаводная станцыя. У першы інкубатар закладзена партыя ў 2.500 племяйкаў. За чатыры месяцы намаганьнямі рабочых, дырэкцыі і ІТР арганізавана і абсталявана фабрыка куранят на 64.000 месц. У гэтым сэзоне павінна быць вывезена 160 тыс. куранят.

Папера

Дабруская паперовая фабрыка за 14 красавіка выпусьціла 40,7 тоны паперы або 50,5 проц., салома-цэлюлёзы выпушчана 7 тон або 58,4 проц.

***

Паняровая фабрыка «Чырвоная Зорка» за 14 красавіка выпусьціла 11,8 тоны паперы, або 56,5 проц., працавала толькі адна машына. Дзьве машыны стаялі з-за недахвату апалу.

Наперад да суцэльнай пісьменнасьці!

Цэнтральны Камітэт нашай партыі ў сваёй апошняй пастанове падкрэсьліў, што **барацьба за суцэльную пісьменнасьць** павінна быць ператворана ў **штодзённую, масава-палітычную работу** ўсіх арганізацый і працоўных **«па сыстэматычным ператварэньні прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў, сельсаветаў, гарадоў і раёнаў у суцэльнапісьменныя».**

Красавік месяц — месяц штурму за завяршэньне барацьбы па ператварэньні БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці, месяц сацыялістычнага спаборніцтва паміж гарадамі і раёнамі, — **хто з найлепшымі вынікамі, з большымі перамогамі прыдзе да фінішу (1 мая).**

Зараз задача раённых арганізацый, сельсаветаў, парт'ячэек, культармейцаў заключаецца ў тым, каб скарыстаць **вопыт перадавікоў, мабілізаваць усе сілы** і кінуць іх на найбольш **адсталыя вучасткі, павысіць колькасны ахоп ліквпунктамі** няпісьменных, **дабіцца максымальнага іх наведваньня.**

Раённыя і мясцовыя штабы па ліквідацыі няпісьменнасьці павінны ўсялякі папулярызаваць работу **ЛЕПШЫХ** ліквідатараў няпісьменнасьці і культармейцаў. **ПРЭМІЯВАЦЬ іх за ЛЕПШЫЯ** паказальнікі, **ПРЭМІЯВАЦЬ** рабочых, калгаснікаў, аднаасобнікаў, якія рэгулярна **наведваюць** ліквпункты і з посьпехам ліквідуюць **сваю няпісьменнасьць.**

Кожнае прадпрыемства, саўгас і калгас павінны **павысіць тэмпы** барацьбы за кожнага новага пісьменнага, **за права** быць у перадавых радох змагароў за суцэльную пісьменнасьць.

Між тым, у радзе раёнаў ня ўзяты бялвыя тэмпы работы, якія-б забясьпечылі пасьпяховае завяршэньне ліквідацыі няпісьменнасьці.

Так, у **Брагінскім раёне** (Астраглядзкі і іншыя сельсаветы) дэкадзнік амаль ня даў ніякіх рэзультатаў па палепшэньні работы ліквпунктаў, па ахопе ліквпунктамі няпісьменных. Раённыя арганізацыі ня ўжылі яшчэ ніякіх захадаў па рэалізацыі апошняй дырэктывы ЦК аб ператварэньні красавіка месяца ў месяц штурму па завяршэньні работы ў галіне ліквідацыі няпісьменнасьці.

У раёне адзначаецца агульнае паніжэньне наведваньня няпісьменнымі ліквпунктаў. Кулацтва, карыстаючыся бязьдзейнасьцю шмат якіх парт'ячэек і сельсаветаў, разгортвае шалёную работу супроць наведваньня няпісьменнымі ліквпунктаў і школ.

Такое становішча наглядзецца і ў **Прапойскім раёне.** Райкалгасаюз, спажывецкая кааперацыя і іншыя раённыя арганізацыі і ўстановы **замест** усямернай **дапамогі, актыўнага** ўдзелу ў барацьбе за пісьменнасьць, **тармозяць работу,** ня выплачваюць сваячасова зарплаты ліквідатарам і культармейцам, не адпускаюць галы, не забясьпечваюць ліквпункты падручнікамі, пісьмовымі прыладамі і г. д.

У **Бярэзінскім раёне** дзесяткі і сотні калгаснікаў і аднаасобнікаў не ліквідуюць сваёй няпісьменнасьці з прычыны недапушчальнай бязьдзейнасьці партыйных ячэек (камуна **«Уперад»,** калгас **імя Калініна,** вёска **Дулебы,** лесазавод **«Ягадка»** і інш.), сельскіх інспэктароў сельсаветаў. Вялікая доля віны кладзецца на інспэктарыят асьветы, райком партыі, які недаацаніў усёй важнасьці работы па ліквідацыі няпісьменнасьці. Райком за ўвесь час толькі адзін раз абгаварваў пытаньне барацьбы за суцэльную пісьменнасьць, прычым **ня даў вычэрпальных указаньняў ячэйкам, не мабілізаваў іх** на актыўную барацьбу.

У паасобных партыйных арганізацыях забываюць на зусім яснае ўказаньне ЦК КП(б)Б аб тым, што **адказнасьць за работу па ліквідацыі няпісьменнасьці нясуць у першую чаргу партыйныя камітэты, ячэйкі, камуністы.**

Там, дзе была разгорнута сапраўды бальшавіцкая барацьба за суцэльную пісьменнасьць, працоўныя будуць сустракаць 1-га мая з вялізарнымі перамогамі на фронце культурнай рэвалюцыі — на адным з важнейшых вучасткаў барацьбы за сацыялізм.

Пралетарыят Гомеля высока трымае чырвоны сьцяг, атрыманы за гераічную работу па ліквідацыі спадчыны царскага ўраду — няпісьменнасьці. Гомель заняў першае месца сярод гарадоў і раёнаў БССР. За Гомелем ідзе Менск, які дабіўся значных перамог у галіне ліквідацыі няпісьменнасьці.

Гэтымі днямі рабочыя чырвонасьцяжнага машынабудаўнічага заводу імя **Варашылава** рапартавалі гаркому аб сваіх перамогах на фронце культурнай рэвалюцыі, аб наближэньні да суцэльнай пісьменнасьці.

На заводзе **няма ні аднаго няпісьменнага рабочага, які-б не наведваў ліквпункту,** або школы. Гэта перш за ўсё розультат баявой, ударнай работы партарганізацыі, камсамолу і прафсаюзаў.

На шляху да суцэльнай пісьменнасьці знаходзіцца фабрыка **«Камунарка»,** швэйная фабрыка **імя Крупскай** і рад іншых прадпрыемстваў Менску.

Полацкі раён пераможна змагаецца за першынства па завяршэньні ліквідацыі няпісьменнасьці. Процант наведваньня няпісьменнымі ліквпунктаў па раёне **дасягае больш як 98. 7 сельсаветаў месяц таму назад абвясьцілі сябе сельсаветамі суцэльнай пісьменнасьці.**

Паказальнымі па **Чэрвеньскім і Рагачоўскім** раёнах таксама гаворыць аб вялізарнай работе, якую правяла партарганізацыя, асьветчыкі, камсамольцы і члены прафсаюзаў па выкананьні дырэктыў партыі аб ператварэньні БССР у рэспубліку суцэльнай пісьменнасьці. Гэтыя раёны 1 мая сустрэнуць суцэльна-пісьменнымі.

Але гэтыя посьпехі не павінны зьвяцца прычынай для зьніжэньня тэмпаў работы. Наадварот. Нельга далей цярпець недаацэнкі барацьбы на важнейшым вучастку культурнай рэвалюцыі.

Дні, якія засталіся да 1-га мая, павінны быць **днямі штурму, днямі інтэнсыўнай ударнай работы.** Там, дзе праграма работы ліквпунктаў яшчэ на выкананы, трэба **падвоіць, патроіць** тэмпы. **АРГАНІЗАВАЦЬ ЗАНЯТКІ ШТОДЗЕННА, ПАВЯЛІЧЫЦЬ КОЛЬКАСЬЦЬ ГАДЗІН.**

Адначасова з гэтым барацьба за сваячасовае сканчэньне прапанаўкі праграм не павінна за сабой пацягнуць пагоршаньня якасьці вучобы. Трэба выкрываць і жорстка змагацца з фактамі пагоні за голай лічбай. Якасьць вучобы павінна ўсямерна павышацца.

Шэфскія таварыствы павінны неадкладна аказаць канкрэтную дапамогу калгасам і вёскам па лініі ліквідацыі няпісьменнасьці, забесьпячэньня бесьперабойнай работы ліквпунктаў.

Трэба скарыстаць усе формы і мэтады работы, каб з найбольшымі перамогамі на фронце культурнай рэвалюцыі сустрэць 1-га мая — сьвята пралетараў і працоўных усяго сьвету.

Бор. П.

Адказны рэдактар **М. ГАРЫН.**

ПАДРЫХТОЎКА ДА 1-га МАЯ

На заводах „Бальшавік" і імя Варашылава

Чырвонасьцяжныя заводы **«Бальшавік» і імя Варашылава** па-баявому рыхтуюцца да сьвяткаваньня 1-га мая. На абодвух заводах распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы да сьвят. Варашылаўцы ўзялі на сябе абавязацельства — **да 1 мая скончыць пераразлоўчэньне саціягаваў паміж цэхамі, гаспадарча-разрахункавымі брыгадамі, агрэгатамі і паасобнымі варштатамі.** Дадаткова пераводзяцца на гаспадарчы разрахунак у такарным цэху варштаты: № 101, 105, 92, 67 і 80. На сьлясарна-зборачным цэху—брыгада камплектаваньня і **заўкомы** ўзялі на сябе абавязак палепшыць работу вучэбных пунктаў і да 1 мая ліквідаваць няпісьменнасьць рабочых па лініі СПА.

2 мая на заводзе імя Варашылава будзе наладжана спаборніцтва на лепшага стралка паміж вучэбным пунктам і падшэфнікамі АБВШ.

Уся падрыхтоўчая работа да сьвят праводзіцца пад кутом ацягненьня лепшых ударнікаў гаспадарча - разрахункавых брыгад у рады ленінскай партыі. На заводзе «Бальшавік» падана ўжо ад рабочых 9 заяў аб уступленьні ў КП(б)Б.

У часе абедзеных перапынкаў у пэрыяд паміж 20 і 23 красавіка на заводах праводзяцца гутаркі аб значэньні першамайскіх сьвят па цэхах і брыгадах.

29 і 30 красавіка адбудуцца ўрачыстыя вечары з удзелам падшэфнікаў ад Чырвонай армії і калгасьнікаў. Да гэтых вечароў прысьвячаецца прамяваньне лепшых ударнікаў вытворчасьці. На заводзе «Бальшавік» адзін лепшы цэх у выкананьні колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну будзе ўзнагароджан пераходным чырвоным сьцягам і грашовай прэміяй у 500 руб. Таксама атрымаюць пераходныя цэхавыя чырвоныя сьцягі 4 лепшыя гаспадарча - разрахункавыя брыгады з розных цэхаў і па 200 руб. грашовай прэміі.

З 20 красавіка ад заводаў пасылаюцца брыгады ў падшэфныя сельсаветы па падрыхтоўцы да сьвята і па аказаньні дапамогі ў правядзеньні веснавой сяўбы.

Ад заводу «Бальшавік» пасылаецца брыгада ў падшэфны конарцыдыв з трох асоб і ў Полацак — 5 асоб для ўручэньня пераходнага чырвонага сьцягу № -скаму стралковаму палку па эстафэце імя XIV гадавіны Чырвонай армії.

У галіне ўмацненьня вайсковай работы парткалектывы і заўкомы ўзялі на сябе абавязак палепшыць работу вучэбных пунктаў і да 1 мая ліквідаваць няпісьменнасьць рабочых па лініі СПА.

Віцебшчына рыхтуецца да 1-га мая

ВІЦЕБСК. Пад знакам падрыхтоўкі да 1-га мая гарком камсамолу праводзіць інтэрнацыянальную эстафэту. Эстафэта ўключае ў сябе наступныя асноўныя пытаньні: **поўны ахоп камсамольцаў ударніцтвам, праверку выкананьня саццагавору, заключанага паміж камсамолам Віцебшчыны і Саксоніяй, павышэньне ўдзелу камсамолу ў нацыянальна-культурным будаўніцтве, поўны ахоп усіх камсамольцаў стралковым конкурсам.**

З 1 красавіка да 1 мая праводзіцца месячнік масавага кантролю і праверкі выкананьня абавязацельстваў, узятых камсамольцамі пры атрыманьні повага білету.

Напярэдадні 1-га мая арганізуецца агульна-гарадзкі камсамольскі вайсковы выхад.

Работнікі мастацтва ўключыліся ў падрыхтоўку да 1-га мая.

У дні 1-га мая арганізуюцца культвылазкі артыстаў БДТ-3, расійскай драмы, ТРАМ'у на прадпрыемствы і ў падшэфныя часьці Чырвонай армії.

Дэкаднік масавай самаправеркі

ЛЕЗНА. У раёне разгарнулася шырокая работа на падрыхтоўцы да 1-га мая. Першамайскай камісіяй абвешчан **дэкаднік масавай самаправеркі** падрыхтаванасьці да сяўбы, выкананьня пастановы ЦК і Калгаспэнтру аб арганізацыі вытворчых брыгад у калгасах, аб прымусовым аграмаджаньні жывёлы, аб разьвіцьці савецкага гандлю і аб культурным будаўніцтве (выкананьне пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б).

У самаправерку ўключаюцца рабселькоры, раённая газэта, партыйныя і камсамольскія ячэйкі і шырокая калгасная грамадзкасьць.

Новыя прадпрыемствы і культурна-бытавыя ўстановы ўступаюць у строй 1-га мая

ТУРАЎ. У часе першамайскіх сьвят у Тураве адбудзецца ўрачыстае адкрыцьцё **новапабудаванай мэблевай фабрыкі.** Мяркуецца скончыць і пусьціць **Пераройскі дрэваапрацоўчы завод.** Адначасова заканчваецца будаўніцтва сталоўкі ў саўгасе, абораў у Перарове, у Карме і ў Танежы і сьвінарнікоў у Пагосьці і Букчы.

1-га мая будзе закладзена будаўніцтва новага **жылога дому** ў Тураве, **дому сацкультуры** ў Запясочны, **майстэрні** МТС, **клюбу** для рабочых у Слабадзе і **лазьні** ў Малішаве.

Першы ў БССР завод па выхадзе дрожджаў

ВІЦЕБСК. Як ужо паведамлялася ў «Зьвязьдзе», **Віцебскі дражджавы завод «Вызваленая праца»** ў 1931 г. і першым квартале 1932 г. заваяваў першае месца ў БССР па выхадзе прадукцыі. У 1931 г. выхад дражджаў складаў 64 проц. пры сярэднім выхадзе па БССР — 60 проц. У першым квартале г.г. завод дабіўся рэкордзнай лічбы — 76 проц.

Якім чынам заводу ўдалося дабіцца такіх посьпехаў?

Асноўныя цэхі пераведзены на гаспадарчы разрахунак. Зьдзельшчына ажыцьцёўлена на ўсе 100 проц. Увесь калектыў заводу прымае актыўны ўдзел у вытворчых нарадах, прысьвечаных павялічэньню выхаду. Загачык вытворчасьці тав. **Гольдбэрг** зьяўляецца першым рацыяналізатарам на заводзе. «Вызваленая праца» амаль поўнасьцю зьнішчыла страты сырцу і шкуфабрыкатаў на вытворчасьці: устаноўлен дакладны ўлік іх выдаткаваньня, наладжан спэцыяльны кантроль шкуфабрыкатаў на вытворчасьці; сырцу, соляй і інш. матэрый. Насеньня дрожджы, якія ўкладаюцца ў чаны, маюць да 55 проц. бялку, што станоўча ўплывае на іх размнажальнасьць.

Ударная работа па выпукваньні новых мэтадаў выпрацоўкі дала магчымасьць значна паніжаць сабекошт. Замест запраектаванага сабекошту 1 кілё дражджаў у 39 кап., завод зьніжаў сабекошт да 34 кап.

На заводзе ўпершыню ў БССР выпрацоўваюцца так званыя сушаныя кубікі тыпу «Магі», якія па сваёй калёрыйнасьці ня ўступаюць мясу.

Брыг.

23 красавіка, а 7 гадз. увеч., у памяшк. рэд. „Зьвязды" (Савецкая, 63, 3-ці паверх) адбудзецца пасяджэньне

КАМІСІІ САДЗЕЙНАСЬЦІ КАМУНАЛЬНАМУ БУДАЎНІЦТВУ

У парадку дня інфармацыі: — загадчыка Менскага аддзяленьня Белбудканторы тав. ЕВЕЛЕЎСКАГА і намесьніка кіраўніка Менбуду тав. СТОЛЯРАВА аб жыльлёвым будаўніцтве, загадчыка цэху дрыўпяных труб тав. МІТЭЛЬМАНА аб выробе труб і дырэктара заводу імя Варашылава тав. ДЗІЧКОЎСКАГА аб выкананьні заказу на фасонныя часткі.

Апрача членаў камісіі (т. т. ШПЭКТАРАВА, МЕЕРОВІЧА, ВАЛОДЗЬКА, ПІНХАСІКА, КЕНІГА, ДАНІЛОВІЧА, ШУЛЬКІНА, ЮДЗІНА, ЛЕВІНА, МОДЛІНА, ФІША, АБРАМСОНА, АНДРЭЕВА, КАВАЛЁВА, ПЯТРОВІЧА, ЛУНГІНА, КАГАНА, ДЫБОЎСКАГА, ЗГЛЕ, АКСЮЧЫЦА і РОЗЭНГАУЗА) запрашаюцца прадстаўнікі будаўніцтваў ЦЭЦ, фабрыкі-кухні, аўтаматычнай тэлефоннай станцыі, Эльводу, заводу стандартных дамоў, кіраўніцтва мясцовага транспэрту, Водаканалу, ЦП саюзу керамікаў, аб'яднаньня будматар'ялаў, камунальна - будаўнічай сэкцыі гарсавету, будсэкцыі ЦКК-РСІ і рэдакцый газэт «Рабочий», «Савецкая Беларусь», «Акцябр» і інш.

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Занежны фільм ЖОНКА СТАТС-САКРАТАРА

ПРАЛЕТАРЫ — Новы фільм вытворч. Дзяржкінпрамгрузіі СКОРЫ № 2

„СПАРТАК" Пач. 6-30, 8, 9-30 і 10-45 КАСА—3 5 ГАДЗ. — Ігар Ільлінскі ў карціне ЗАКРОЙШЧЫК З ТАРЖКА камэдыя ў 6 частках.

Шукаю службу ў якасьці сакратара або іншую працу. Паведаміць: Горбарная вул. 47, кв. 2, Адамовіч.

Інстытуту гісторыі партыі **ПАТРЭБНЫ 2 МАШЫНІСТКІ** на сталую працу і на вячэрнюю зьмену.

КІНО „Чырвоная Зорка" *СЁНЬНЯ і штодзенна* Занежны мастацкі фільм

КАПІТАН КРЫЛАТАЕ ЧАРАПАХІ

драма ў 8 частках.

У ГАЛ. РОЛІ: Філіс Хэвэр і Аллан Хэль.

Штодзённа 4 сэансы. Пачатак у 6, 7-30, 9 і 10-30.

— Каса—ад 1 гадз. дня. —

ДЗЕЦІ Ў КІНО НЕ ДАПУСКАЮЦЦА.

Пасьля III звонка уваход у залю закрыт.

СЁНЬНЯ, у 7 гадз. веч., у клюбе Нарсуды (Ленінская, 34)

ДЗЯРЖАРБІТРАЖАМ з удзелам грамадзкасьці

БУДУЦЬ РАЗГЛЕДЖАНЫ СПРЭЧКІ

паміж выдавецтвам „ЗЬВЯЗДА" і Саюздрукам Бел. кіраўніцтва сувязі

аб недахопах па дастаўцы газэт і часопісяў.

Запрашаюцца рэдакцыйна-выдавецкія работнікі, рабкоры і чытачы газэт.

Уваход вольны

Дзяржм. арбітр. пры СНК БССР.

Менск, друкарня газ. «Зьвязда».

Галоўлітбел № 337.